менного белорусского сельского хозяйства и промышленности. Белоруссия, разоренная войной, превратилось в современную индустриальную республику – ее промышленная продукция к началу 1980-х гг. поставлялась в более чем 100 государств мира, в том числе в США, Канаду, Германию. Именно тогда завоевали популярность белорусские «БелАЗы», «МАЗы», тракторы «Беларусь», минские холодильники. При непосредственном участии и внимании Машерова были открыты памятники Я. Коласу и Я. Купале, учреждены многочисленные журналы, издательства, возведены дворцы и центры культуры и искусства, построен Дворец спорта, реконструирован футбольный стадион «Динамо»... Он всячески поддерживал и знаменитый ансамбль «Песняры». Однако в рамках тех возможностей, которые были у руководителя союзной республики, Машеров проявлял самостоятельность и старался реализовать собственное видение путей развития советской экономики и сельского хозяйства.

Петра Мироновича не стало 4 октября 1980 г. Трагедия произошла на дороге Брест – Москва. Белорусы увековечили память о замечательном человеке: в Витебске установлен бюст, в Центральном музее Великой Отечественной войны в Минске ему посвящен отдельный стенд. В 1998 г. Витебскому государственному университету присвоено имя П. М. Машерова. Имя П. Машерова носят ГП «Совхоз имени Машерова» (деревня Мошканы Сенненского района Витебской области), а также СПК «Машеровский» (деревня Крытышин Ивановского района Брестской области).

ЛИТЕРАТУРА

1. А н а т о л ь е в, В. П. Загадки Петра Машерова / В. П. Анатольев. – Минск : Союзное Вече. – В. 13.02.2008.

2. Г р а б о в с к и й, С. М. Партийное подполье в Белоруссии. 1941–1944 / С. М. Грабовский, С. А. Портасенок. – Минск : Беларусь. 1984. – 386 с.

УДК 929

**Барабаш В. В.** – студэнт

## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ НАПАЛЕОНА ОРДЫ

*Навуковы кіраўнік – **Куніцкая А. М.** – ст. выкладчык*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Чалавекам рэнесанснага тыпу называюць сучаснікі Напалеона Орду. Кампазітар, мастак, музыкант, асветнік, педагог… Тое, што

зрабіў гэты чалавек для Беларусі, называюць подзвігам. Напалеон Орда ўвайшоў у гісторыю як майстар архітэктурнага пейзажу. Ён шмат вандраваў, рабіў замалёўкі архітэктурных пейзажаў Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы, Францыі і іншых краін. Яго творы ўяўляюць велізарную каштоўнасць для гісторыкаў культуры і рэстаўратараў. Сярод музыкантаў Н. Орда вядомы як заснавальнік беларускай школы піянізму. Яго творы гучалі на сцэнах Францыі, Германіі, Польшчы, Расіі. Напалеон Орда вядомы і як лінгвіст. Ён з'яўляўся членам Польскага гісторыка-літаратурнага аб'яднання і перакладаў паэзію аўтараў, якія нарадзіліся ў Беларусі, на французскую мову, а яшчэ ў 1856 г. надрукаваў падручнік польскай мовы для іншаземцаў.

Нарадзіўся Напалеон Орда ў 1807 г. у радавым маёнтку Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерні (зараз Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і палескай шляхты. Яго бацька быў інжынерам-фартыфікатарам, працаваў на будаўніцтве дарог і каналаў, а ў час падзелу Рэчы Паспалітай з'яўляўся маршалкам Кобрынскага павета. Пачатковую адукацыю мастак атрымаў у родным доме. А з 12 гадоў – у Свіслацкай гімназіі. У 1823 г. паступіў у Віленскі ўніверсітэт, дзе вывучаў матэматыку і ўваходзіў у студэнцкае таварыства «Заране», члены якога марылі пра незалежнасць зямель былой Рэчы Паспалітай, адкрыта выказвалі свой пратэст супраць палітыкі царскіх уладаў, запальвалі рэвалюцыйнымі настроямі вучняў і педагогаў. У 1826 г. быў выключаны з універсітэта. Разам з А. Міцкевічам, І. Дамейкам, Я. Чачотам быў арыштаваны і больш чым год правёў у Віленскай турме.

З 1833 г. Н. Орда ў Парыжы, дзе і атрымоўвае мастацкую адукацыю ў студыі вядомага майстра архітэктурнага пейзажу П'ера Жэрара, які і вызначыў яго мастацкі жанр. Для сваёй творчасці Напалеон Орда выбраў тэхніку алоўкавага малюнка, якой дасканала валодаў. Менавіта гэтая тэхніка малявання дазваляла аператыўна і найбольш дакладна адлюстраваць натурны архітэктурны краявід ва ўмовах падарожжа. Малюнкі Орды вызначаюцца дакументальнасцю, праз што маюць велізарную каштоўнасць, таму што многія помнікі захаваліся толькі ў яго акварэлях ды малюнках.

У 1856 г. Н. Орда вяртаецца на радзіму, шмат падарожнічае па ўсёй Беларусі, робіць архітэктурныя накіды найбольш значных помнікаў, замалёўкі мясцінаў, звязаных з жыццём выдатных асобаў, славутых помнікаў старажытнасці. Вынікам гэтых вандраванняў з'явіўся велізарны збор мастацкіх твораў, гэта больш за 1150 малюнкаў і акварэляў, больш за 200 літаграфій. У 1860–1862 гг. выдае серыю са

144 малюнкаў, сярод якіх панарамы Гродна, Пінска, Бярозы, Іванава , Пружан і інш. Архітэктура ў малюнках Н. Орды з’яўляецца галоўным прадметам, галоўным героем, дзе ён дэтальна перадае наваколле, фрагменты паркаў, рэчак, азёр і г. д.

Напалеон Орда захапляўся музыкай. Сябраваў з Ф. Шапэнам, спачатку займаўся пад яго кіраўніцтвам, пасля чаго ўжо сам выдатна іграў на фартэпіяна і нават выкладаў, а ў 1847 г. з’яўляўся дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. Музычныя творы самога Н. Орды, асабліва паланэзы, мазуркі і вальсы, вылучаюцца самабытным і віртуозным стылем. Напалеон Орда ствараў рамансы і песні на словы С. Вітніцкага і А. Плуга, выдаў «Альбом твораў польскіх кампазітараў» (1838). Н. Орда быў аўтарам славутай «Граматыкі музыкі», што выйшла ў 1873 г. і была высока ацэненая Станіславам Манюшкам, які лічыў Н. Орду сваім настаўнікам.

Памёр Напалеон Орда ў 76-гадовым узросце ў Варшаве, а згодна з завяшчаннем быў пахаваны ў радавой усыпальніцы ў Янаве, цяпер – горад Іванава Брэсцкай вобласці.

Сёння мясцовыя ўлады ўжо шмат зрабілі, каб спадчына Напалеона Орды стала здабыткам нашага народа. Адбываюцца пленэры на яго радзіме, ў тым ліку і міжнародны, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння мастака. Праводзяцца канферэнцыі, прысвечаныя яго жыццю і творчасці. На скрыжаванні дарог Брэст – Пінск – Варацэвічы знаходзіцца памятны знак «Родныя мясціны Напалеона Орды». У 2005 г. у Варацэвічах Іванаўскага раёна быў заснаваны музейны комплекс Напалеона Орды, які дэманструе як экспанаты, звязаныя з лёсам мастака, так і копіі літаграфій і акварэляў Н. Орды. Уся экспазіцыя размешчана ў пяці залах, у якіх ёсць і мемарыяльны пакой знакамітага земляка, дзе работнікі музея пазнаёмяць вас з гісторыяй роду Ордаў, генеалагічным звесткамі пра мастака і яго біяграфіяй. У асобнай зале размешчана экспазіцыя літаграфій і акварэляў Напалеона Орды.

Большасць мастацкіх твораў Орды цяпер знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Кракава, частка – у Нацыянальным музеі Варшавы. Вялікая калекцыя літаграфій з яго малюнкаў захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. К л и м ч у к, В. Гордость земли полесской / В. Климчук // Заря. – 2013. – № 18.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. – Мінск: БСЭ імя П. Броўкі, 1999. – 592 с.

УДК 94(476)
**Брычиков Д. А.** – студент

**ЧЕЛОВЕК С ФОТОАППАРАТОМ: ВОЕННЫЙ И ТРУДОВОЙ ПОДВИГ СОКОЛОВА КОНСТАНТИНА ЕГОРОВИЧА**

*Научный руководитель – **Тарелкин А. И.** – ст. преподаватель*
УО «Белорусско-Российский университет»,
Могилев, Республика Беларусь

На протяжении жизни этого человека, Соколова Константина Егоровича, жизнь и героизм стали словами-синонимами. Его молодость прошла в самые страшные годы 20-го столетия, в годы Великой Отечественной войны.

Родился он в 1917 г. в г. Чермоз Пермской области, где окончил ремесленное училище и работал токарем-арматурщиком, дошёл до шестого разряда, но увлечение фотоделом взяло верх над токарским. Оставив прежнюю работу на заводе, Соколов становится фотографом, не подозревая, что эта работа выбрана им на всю жизнь. В 1938 г. был призван в Красную Армию. Служил на Дальнем Востоке, где и застала его Великая Отечественная война.

Дальневосточные войска, как известно, оставались на страже границ Родины, и на фронт отбывали только те, кто добровольно изъявлял желание. В числе добровольцев был и старший сержант Константин Соколов. В качестве замполитрука, потом политрука роты в 1942 г. Соколов участвует в прорыве линии вражеского фронта в направлении г. Вязьмы, во взятии железнодорожной станции Темкино Смоленской области. С наступлением осени 1943 г. 192-я стрелковая дивизия, где находится фотограф политотдела дивизии Соколов, нас-тупает с последующим освобождением городов Смоленск и Красный. Под Дубровно дивизия удерживает правый фланг польской дивизии имени Т. Костюшко во время ее наступления под Ленино.

Затем участие в операции «Багратион». В состав 3-го Белорусского фронта входит 5-й гвардейский стрелковый корпус под командованием генерал-лейтенанта Безуглова. Старшина Константин Соколов, фотограф штаба корпуса, принимает участие в освобождении от немецко-фашистских оккупантов белорусских городов Орша, Борисов, Минск.

В конце 1944 г. автомашина генерала Безуглова, в которой находился и Соколов, попадает под артобстрел. Генерал, его адъютант и шофер остались невредимыми, а Соколов от взрывной волны получает контузию 1-й степени. В госпитале, куда привез Соколова шофер ге-

нерала, врач при невнимательном осмотре заключил: «Неживой, закопать». Непохороненным он остался благодаря шоферу, которому показалось, что он дышит. Догадка эта подтвердилась.

После выхода из госпиталя Константин Соколов находился при политотделе 39-й армии, а закончилась военная одиссея старшины Константина Егоровича Соколова в г. Порт-Артуре, откуда был демобилизован осенью 1945 г.

Четыре года находился Константин Соколов в действующей армии в качестве фотографа. Кто читал роман Л. Первомайского «Дикий мед», помнит, в каких смертоносных ситуациях приходилось бывать фронтовым фотографам, одним из которых был и Соколов. Он запечатлял на своих снимках солдат, офицеров, их подвиги, трофеи, жизнь людей на освобожденных территориях.

Соколов был награжден орденами Красной Звезды и Отечественной войны 2-й степени, медалями «За отвагу», «За победу над Германией в Великой Отечественной войне», юбилейными медалями.

В Горках Константин Егорович оказался не случайно. В Пруссии он встретился с поваром штабной столовой Надеждой Куприяновной Лапеза, девушкой из Горок. Встретились, чтобы не расставаться. В начале 1946 г. Константин Егорович Соколов приезжает в Горки. Работал вначале фотографом в комбинате бытового обслуживания, затем в Белорусской сельскохозяйственной академии заведующим кинофотолабораторией, лаборантом, учебным мастером. Принимал активное участие в гражданско-патриотическом воспитании молодежи. И ему было что рассказать и показать. Он, человек с фотоаппаратом, в годы войны занял место в боевых рядах, стал солдатом. Жертвуя подчас своей жизнью, не жалея сил, он создал правдивую и впечатляющую летопись событий войны. И не для прославления войны, а для укрепления мира, для возвышения сражающегося за свою Родину и свои идеалы человека [1].

ЛИТЕРАТУРА

1. Л и в ш и ц, В. М. Гордость и слава Горецкой земли: Герои Социалистического Труда, заслуженные работники народного хозяйства, культуры, художники и писатели / В. М. Лившиц. – Горки, 2015. – 62 с.

УДК 808.26(072)

**Вятоха А. А., Кірыковіч Г. Э.** – студэнткі

# СУЧАСНАЯ МОЎНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*Навуковы кіраўнік* – ***Селібірава Л. У.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Кажуць, мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.
*П. Панчанка*

У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. Рэспубліка Беларусь становіцца незалежнай, суверэннай дзяржавай. Была створана пэўная заканадаўчая база, якая юрыдычна замацавала курс на адраджэнне нацыянальнай мовы. Былі прыняты законы "Аб мовах у Беларускай ССР", "Аб культуры", "Аб адукацыі", разгорнута сетка беларускіх нацыянальных школ. Распрацавана дзяржаўная праграма, якая сведчыла пра тое, што пачынаецца новы этап адраджэння беларускага слова ў развіцці і ўзбагачэнні беларускай мовы і беларускай культуры ў цэлым. У новых праграмах значная роля адводзілася вывучэнню беларускай мовы. Рыхтуюцца новыя падручнікі, а праз некалькі гадоў гэты курс становіцца абавязковым для вывучэння ў ВНУ.

Такі ўздым нацыянальнага адраджэння запаволіўся пасля рэспубліканскага рэферэндума 1995 г. У "Закон аб мовах" і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь былі ўнесены праўкі, па якіх у якасці дзяржаўнай разам з беларускай названа руская мова. Беларуская мова значна страціла свой нацыянальны прэстыж. Яна зноў стала выкарыстоўвацца пераважна ў сферах мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, гуманітарнай навукі, адукацыі.

Сёння, гаворачы пра стан і перспектывы развіцця беларускай мовы, даследчыкі ўказваюць на сімвалічнае значэнне мовы, адзначаючы, што камунікатыўная роля ёй амаль не ўласціва. У беларускай мове яе этнічная функцыя (быць нацыянальным сімвалам, кансалідаваць народ і адрозніваць яго ад іншых этнасаў) першынствуе над асноўнай (камунікатыўнай). Чалавек ведае, што ён беларус, што яго продкі жылі ў Беларусі, ён сам у пэўнай ступені валодае беларускай мовай, але ў рэальным жыцці можа ёю не карыстацца.

Такім чынам, сучасная Рэспубліка Беларусь – краіна з шырока распаўсюджаным двухмоўем (білінгвізмам). Праблема моўнага жыцця ў нашай краіне сёння адносіцца да адной з актуальных.

На тэрыторыі Беларусі двухмоўе існавала даўно, аднак яго характар і састаўныя кампаненты мяняліся. Ужо ў перыяд Вялікага княства Літоўскага існавала беларуска-царкоўнаславянскае пісьмовае і вуснае двухмоўе. З пашырэннем на тэрыторыі Беларусі польскай мовы пачало складвацца беларуска-польскае двухмоўе. Пазней, калі пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі адышлі да Расіі і функцыі афіцыйнай мовы ў значнай ступені стала выконваць руская мова, шырока развіваецца беларуска-рускае двухмоўе. У раёнах сумеснага пражывання беларусаў з іншымі народамі фарміравалася беларуска-літоўскае, беларуска-ўкраінскае, беларуска-латышскае двухмоўе.

Сучасная моўная сітуацыя на Беларусі характарызуецца пераважна суіснаваннем і выкарыстаннем беларускай і рускай моў і можа быць вызначана як беларуска-рускае двухмоўе. Сапраўды, значная частка насельніцтва Беларусі актыўна карыстаецца і рускай, і беларускай мовамі ў розных сферах грамадскай дзейнасці. Аднак ёсць людзі, якія практычна карыстаюцца толькі якой-небудзь адной мовай. Калі ж браць пад увагу і пасіўнае валоданне другой мовай, і ўспрыманне на ёй пэўнай інфармацыі, то трэба прызнаць, што ўсё беларускае насельніцтва з’яўляецца двухмоўным.

На ступень валодання беларускай і рускай мовамі моцна ўздзейнічае моўнае асяроддзе. Можна назіраць прафесійна арыентаваны білінгвізм у настаўнікаў беларускай мовы, дыктараў радыё і тэлебачання, якія беларускую мову выкарыстоўваюць пры выкананні службовых абавязкаў, а на бытавым узроўні – рускую.

Праблема мовы знаходзіць адлюстраванне ў беларускіх СМІ. У складаны час інтэграцыі з Расіяй нацыянальна свядомых беларусаў хвалюе тое, што мы можам згубіць свае нацыянальныя здабыткі, родную мову і ў выніку апынуцца ў лагасферы хаця і блізкай, але чужой культуры. У беларускім перыядычным друку чытаем загалоўкі артыкулаў: “Выпрабаванне мовай” (“Звязда”, 12 студзеня 2016 г.), “Каб размаўляць па-беларуску … зусім не абавязкова быць настаўніцай” (“Звязда”, 20 лютага 2016 г.) і іншыя.

Такім чынам, моўная сітуацыя на Беларусі надзвычай складаная. Адбываецца вялікі ўплыў на яе з боку рускай мовы. І гэта вельмі ярка адбіваецца на беларускіх СМІ.

Напрыклад, 90 % кніжнага рынку Беларусі – расійскія кнігавыдаўцы. Такая сітуацыя ў літаратуры з’яўляецца небяспекай для нацыі, для народа, які без Богам дадзенай мовы і створаных на ёй твораў страціць магчымасць нацыянальнага самапазнання, развіцця і перастане быць тым, кім з’яўляецца. Але ёсць і станоўчыя вынікі шанавання мовы.

Паэзія заўсёды адгукаецца на самыя балючыя праблемы жыцця. Яркім прыкладам з’яўляюцца шматлікія творы П. Панчанкі, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, Д. Бічэль-Загнетавай, С. Грахоўскага, Р. Баравіковай і іншых.

У апошні час у краіне бачна абуджэнне цікавасці да роднай мовы. Друкуюцца часопісы і газеты, прысвечаныя беларускай паэзіі, прозе, драматургіі (“Роднае слова”, “Рэспубліка”, “Наша ніва” і іншыя). Пішуць па-беларуску сучасныя аўтары: Л. Дранько-Майсюк, А. Хадановіч, В. Жыбуль і іншыя.

Гучыць беларуская музыка. Яна вельмі разнастайная ў жанравым сэнсе. Найбольш шырокае прызнанне на Беларусі атрымала так званая папулярная музыка. Ля вытокаў беларускай поп-музыкі стаяць такія вядомыя сёння групы, як “Песняры”, “Верасы”, “Сябры”, “Бяседа”. Гэта мэтры нашай беларускай эстрады, якія карыстаюцца папулярнасцю і вядомасцю ў беларускіх слухачоў.

Гаворачы пра сучасную поп-музыку, не трэба забываць пра людзей, якія яе пішуць. І тут трэба назваць імёны, вядомыя, напэўна, амаль кожнаму беларусу: Я. Глебаў, І. Лучанок, Э. Ханок, Л. Захлеўны і інш.

Шырока вядомыя ў рэспубліцы і па-за яе межамі выканаўцы Я. Паплаўская, А. Ціхановіч, А. Саладуха, І. Афанасьева, Алеся, І. Дарафеева, група “Дразды” і іншыя.

У цэнтры канцэртнай дзейнасці стаіць Беларуская дзяржаўная філармонія. Беларусь мае высокапрафесійныя калектывы: акадэмічны хор Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча, Дзяржаўны харэаграфічны ансамбль “Харошкі”, нацыянальнае тэатральна-канцэртнае аб’яднанне “Беларуская капэла”, дзяржаўны ансамбль народнай музыкі “Свята”. Атрымліваецца, што беларуская музыка, захаваўшы народныя традыцыі, актыўна развіваецца і з’яўляецца неад’емнай часткай нацыянальнай культуры і жыцця кожнага беларуса.

Такім чынам, беларуская мова развіваецца, аднак хочацца, каб гэта адбывалася больш актыўна. Усё ў нашых руках. Гаварыце па-беларуску, любіце і шануйце родную мову!

ЛІТАРАТУРА

1. Л у к а ш а н е ц, А. А. Беларуская мова ў сучасным свеце / А. А. Лукашанец // Полымя. – 2010. – № 9. – С. 138–151.

2. М е ч к о в с к а я, Н. Б. Языковая ситуация в Беларуси: этические коллизии двуязычия / Н. Б. Мечковская // Russian Linguistics. – 1994. – Вып. 18. – С. 299–322.

УДК 94(476.7-21 Барановичи)

**Гаврилюк Н. И.** – студент

## ТРАГЕДИЯ ХОЛОКОСТА В г. БАРАНОВИЧИ

*Научный руководитель* – ***Козлова З. Н.*** *– канд. ист. наук, доцент*
УО «Барановичский государственный университет»,
Барановичи, Республика Беларусь

Прошло более 70 лет с момента окончания Великой Отечественной войны, все меньше остаётся ветеранов войны, которые были свидетелями и участниками тех трагических событий. Актуальность темы исследования заключается в том, что коллективная память народа должна сохранять и героические и трагические страницы нашей истории. Одной из них является Холокост в Беларуси.

По данным исследователей, в полиэтнической Беларуси в предвоенный период проживали 7,9 млн. белорусов, 940 тыс. евреев, 930 тыс. поляков, 590 тыс. русских, 160 тыс. украинцев, 90 тыс. литовцев, 6,5 тыс. немцев. В июне – августе 1941 г. только 150–180 тыс. евреев смогли выехать в тыл СССР. Таким образом, в Беларуси оставались 650–680 тыс. евреев, из которых большинство (570 тыс.) жили в городах. Кроме этого, на территории Беларуси, спасаясь от нацистского преследования, находились около 110 тыс. еврейских беженцев из Польши [1, с. 10–11].

В довоенное время люди жили и даже не задумывались о национальностей своих друзей и соседей. На вопрос: «Вы дружили с еврейскими детьми?» – минчанин Иосиф Авсеевич отвечал: «Нам было без разницы, до войны мы этого не чувствовали, не знали. У меня в классе было половина на половину, но все друзья, и никогда этого вопроса не возникало, это потом уже, во время войны. Я даже не знал, кто мы по национальности, меня это совершенно не интересовало, и не только

меня. Потом я уже знал, что такие были, мы в гетто встретились, а так я… Это не имело значения никагого» [1, с. 44].

Истребление евреев германскими оккупационными властями на территории Беларуси началось уже в первые месяцы войны. 27 июня 1941 г. гитлеровские войска оккупировали г. Барановичи, а уже на следующий день был озвучен приказ военного коменданта города относительно еврейского населения. Евреям предписывалось ходить только посередине улицы и иметь на одежде спереди и сзади специальный знак, который ставил их вне закона. В тот же день евреев насильственно выселили на окраину города под названием «Сахалин», а затем в огражденной части в центре города создали гетто. В декабре 1941 г. в гетто города содержалось около 15 тыс. заключенных. Это были жители самого областного центра, райцентров Городище и Новая Мышь, близлежащих местечек и деревень, городов Новоельня и Новогрудок [2, с. 32]. Так начиналась страшная история Барановичского гетто, подобная на десятки других, состоящая из судеб 18 750 уничтоженных здесь и нескольких сотен чудом уцелевших. В ней и нечеловеческие условия существования, издевательства, унижения, и попытки спастись при помощи побегов, сооружение «малин», и акции массового уничтожения, и подпольная борьба. История Холокоста в Барановичах сохранилась в архивных документах, материалах судебных процессов над палачами, мемуарах руководителей и участников партизанского движения, воспоминаниях выживших. Бежавшая из Барановичского гетто 15-летняя Женя Брук в своих показаниях, когда собирались материалы для Нюрнберского процесса, свидетельствовала о злодеяниях фашистов как в Барановичском гетто, так и в концлагере Освенцим, куда она попала позже и смогла выжить. На её руке так и остался нанесенный здесь несмываемый номер смертника [2, с. 36; 3, с. 13].

В течение 1942 г. в гетто были проведены три акции по уничтожению узников. После первой из них 4 марта 1942 г. территория гетто была уменьшена наполовину. На столько же уменьшилось и число заключенных. Вторая акция проводилась в период с 22 сентября по 2 октября 1942 г. За этот период было расстреляно 5 тыс. человек. Последняя акция началась 17 декабря 1942 г. [4, с. 264].

После проведения акции уничтожения по территории бывшего гетто прошли полицейские с собаками, которые обнаружили в одном из сооруженных хранилищ спрятавшихся 15 человек. Среди них был Н. З. Сингловский, которому еще в 1933 г. в Берлине была присвоена ученая степень за научные исследования по химии редких металлов.

Он вместе с женой принял цианистый калий. Также покончил с собой и известный в городе врач Л. С. Нахимовский [2, с. 40].

Еще одной страницей Холокоста на территории Беларуси является уничтожение евреев, вывезенных из Западной Европы. Известно, что только в Тростенецком лагере из 206,5 тыс. погибших не менее 20 тыс. составили иностранные евреи и около 60 тыс. – евреи из Беларуси [1, с. 13]. В Барановичи привозили для расстрела граждан еврейской национальности из Чехословакии, Польши, Австрии, Германии. В конце июля 1942 г. в специальных эшелонах были привезены чехословацкие подданые с семьями, преимущественно интеллигенция (врачи, инженеры, учителя и др.) в количестве 3 тыс. человек. По прибытии эшелона на станцию привезенным было предложено оставить все свои вещи, сесть в машины и поехать на обед. Под предлогом обеда вывезли их из города на расстояние 2 километров в урочище Гай и там расстреляли. Часть была умерщвлена во время перевозок в «душегубках» [2, с. 44]. В урочище Гай сейчас сооружен мемориал, а до 1969 г. по причине того, что эта акция была тщательно законспирирована, не было ничего известно о том, кто там расстрелян.

Уничтожение привезенных в Барановичи евреев велось скрытно и документально чаще всего не отображалось, поэтому точные данные ни в одном из источников не приводятся. Исследователи сделали вывод, что в г. Барановичи уничтожено примерно 2 тыс. евреев из Германии, 500 – из Польши и 300 – из Австрии и др. [2, с. 45].

В настоящее время память о жертвах Холокоста в городе и его окрестностях увековечена. Создан мемориал в урочище Гай, установлены памятные знаки на улицах города, по которым проходила граница гетто, содержатся в надлежащем состоянии места захоронений в городе и его окрестностях. Но, к сожалению, из сознания и памяти молодого поколения жителей города трагические события 1941–1945 гг. уходят.

ЛИТЕРАТУРА

1. Спасенная жизнь: Жизнь и выживание в Минском гетто / сост. В. Ф. Балакирев [и др.]. – Минск: ООО «Лимариус», 2010. – 100 с.

2. Ш е р м а н, Б. П. ... И ужаснулась земля: Факты, документы, свидетельства о зверствах немецких фашистов на территории города Барановичи и его окрестностей / Б. П. Шерман. – Барановичи, 1990. – 75 с.

3. С м о л е н ь, К. Государственный музей в Освенциме: Путеводитель / К. Смолень. – Освенцим, 2007. – 24 с.

4. Преступление немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944: Сборник документов. – Минск: Беларусь, 1965. – 464 с.

УДК 476:908

**Галкін В.** – студэнт

# КРУПАВА. ГІСТОРЫЯ НАСЕЛЕНАГА ПУНКТА

*Навуковы кіраўнік – **Ю. В. Кірчук** – ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Беларускі архітэктурны краявід неад'емна звязаны з палацава- і сядзібна-паркавымі ансамблямі колішніх буйных магнатаў і заможнай шляхты. На працягу XVIII–XIX стст. беларускія землі пакрыліся густой сеткай магнацкіх рэзідэнцый, якія не толькі мелі значныя мастацка-эстэтычныя якасці, але часта з'яўляліся культурна-асветніцкімі асяродкамі. Аднак час і ліхалецці значна спустошылі скрыню нацыянальнага архітэктурна-мастацкага набытку народа.

І толькі ў апошнія дзесяцігоддзі прымаюцца пэўныя намаганні па аднаўленні непаўторнай чароўнасці маёнткаў – тых, што яшчэ захавалі сваю архітэктурна-планіровачную аснову. Многія са спаленых, разрабаваных, занядбаных сядзіб былі ў мінулым калыскай беларускай інтэлігенцы і асяродкамі барацьбы за нацыянальную незалежнасць, крыніцай творчага натхнення выдатных дзеячаў навукі і культуры не толькі нашага, але і суседніх народаў.

Асаблівую цікавасць у мяне выклікала гісторыя Лідчыны, ад якой засталіся толькі падмуркі ды ўспаміны – страчаная спадчына. У сваёй рабоце я звярнуў увагу на гісторыю аднаго населенага пункта – Крупава. Задача маёй работы – падрабязна апісаць, даследаваць, каб прыцягнуць увагу да гістарычнай спадчыны малых населеных пунктаў Беларусі і, магчыма, паставіць пытанне аб іх кансервацыі.

Паблізу ад вёскі Жырмуны Воранаўскага раёна, якая ў мінулыя часы мела статус мястэчка і магдэбургскае права (1724–1776 гг.), размешчаны "маленькія" Жырмуны Лідскага раёна. Усякі, хто праязджае міма Вялікага Сяла, злева ад шашы за кіламетр бачыць цагляна-чырвоныя сцены нейкіх старажытных збудаванняў – там і размешчана гэтае паселішча. Цагляна-чырвоныя збудаванні, што разбураюцца, – гэта флігелі і ўязная брама былога маёнтка Радзівілаў-Тышкевічаў-Шванебахаў-Ельскіх, які называўся Жырмунскі двор.

Пра вёску Крупава (да 1939 г. – Крупа) звесткі вельмі абмежаваныя. Па звестках Т. Нарбута, у 1450 г. тут быў заснаваны касцёл, да якога мы звернемся пазней. Наяўнасць касцёла гаворыць пра тое, што

паселішча было не з маленькіх. У Радуні, Балотне (сучаснае Воранава), Жалудку касцёлаў яшчэ не было.

Паселішча Крупава (Krupa) абазначана на карце Т. Макоўскага 1613 г. выдання. З XVI ст. Крупай валодалі Шукевічы. Ёсць звесткі, што Крупай валодалі таксама Нарбуты. У некаторых гістарычных працах паведамляецца, што Казімір Даніэль Нарбут нарадзіўся не ў Дакудаве, а ў Крупаве.

Назву сваю вёска атрымала ад рачулкі Крупкі, што ўпадае ў Дзітву. Беларускія тапаністы (Жукевіч, Юрэвіч) лічаць, што р. Крупка паходзіць ад назвы расліны з сям'і крыжакветкавых – крупка. Крупкі пералескавая, сібірская і стэпавая растуць на беларускіх сухіх лугах, на ўзгорках, на схілах, на папарах. Расліна з дробнымі белымі і бляклажоўтымі кветачкамі з далікатнымі лісточкамі. З плодастручкоў восенню вылушчваюцца зярняткі (крупкі). З-за мноства гэтай расліны рэчку назвалі Крупкай, а затым і вёску Крупай, а пасля вайны абрасеелі, назвалі Крупава. Вядома мноства паселішчаў у краіне з падобнымі назвамі: Крупейкі, Крупіца, Крупкі, Круплі, Крупля, Крупня, Крупскі, Круповічы, Крупішчы і г. д. У Лідзе і на Лідчыне шырока распаўсюджаны прозвішчы Крупа, Крупіца.

Дакладна вядома, што ў пачатку XX ст. былі дзве Крупы, Першая і Другая, у іх жылі 235 чалавек, якія валодалі 251 дзесяцінай зямлі. Побач, у маёнтку Крупа, які належаў Шукевічам, жыў 251 чалавек. За маёнткам лічылася 400 дзесяцін зямлі. Шукевічы валодалі таксама фальваркам Пурсці (290 дзесяцін, 13 работнікаў) і засценкам Чырвоным (5 работнікаў) [2].

Славіцца Крупава касцёлам Святой Троіцы. Крупаўскі касцёл быў заснаваны ў 1450 г. (паводле Т. Нарбута). Гэта быў трэці ці чацвёрты касцёл на Лідчыне пасля Лідскага, Ваверскага і, магчыма, Дылеўскага. У 1580 г. лідскі ксёндз Юшынскі праводзіў службы ў Крупаўскім касцёле і меў званне пробашча Лідскага і Крупаўскага. Паводле інвентара 1777 г., Крупаўскі касцёл ў 1762 г. выглядаў так: стары, драўляны, маленькі, крыты гонтай касцёльчык з дзвярыма на завесах, з жалезнай засаўкай, з алтаром Святой Троіцы і абразам Яна Непамуцэна. Праз 105 гадоў, у 1882 г., у Крупе – філіяльная старая драўляная капліца з вежай, абабітая дошкамі ў 1851 г. стараннямі ксяндза Кавалеўскага. "У капліцы былі тры алтары: Святой Троіцы, Прасвятой Багародзіцы і Святога Пятра, 8 падсвечнікаў, 3 сутаны, сігнатурка і двухфунтовы званочак. Усё гэта належала ўладальніку

крупаўскага маёнтка Тадэвушу Шукевічу" (Інвентарны вопіс Лідскага рымска-каталіцкага касцёла і бенефіцыі ад 29 траўня 1882 г.).

З успамінаў старажылаў вядома, што ў пачатку ХХ ст. стары касцёл знаходзіўся на мясцовых могілках, але ў выніку пажару згарэў. Безумоўна, паўстала пытанне пра будаўніцтва новага касцёла, тым больш што, паводле Рыжскай дамовы 1921 г., Заходняя Беларусь адышла да Польшчы, а палітыка пашырэння каталіцкай веры актыўна падтрымлівалася ўладамі Польшчы. Дазвол на будаўніцтва новага касцёла мог даць толькі біскуп, які павінен быў не толькі дазволіць, але і асвяціць месца пад новае будаўніцтва. Удалося адшукаць праект будаўніцтва сучаснага касцёла ў Крупаве, выкананы цывільным інжынерам Е. Кулешам 28 снежня 1922 г.

Паглядзеўшы ўважліва на выявы, можна ўбачыць, што касцёл быў задуманы, а пазней і пабудаваны ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі для культавых установаў. У аснове – лацінскі крыж. Выразна відаць тры асноўныя часткі хрысціянскага храма: бабінец, цэнтральная частка, прэсбіторый (алтарная частка). Пры прэсбіторыі – сакрысція, дзе зберагаліся прыналежнасці культу. Новы касцёл вырашана было пабудаваць з шайбакоўскай цэглы. Будматэрыялы спецыяльна заказвалі на цагляным заводзе ў Шайбаках. Цэглу перш клалі на тыдзень у ваду, прычым на будаўніцтва адбіралі толькі якасны матэрыял. Кладку рабілі майстры з Варшавы, а дапаможныя работы выконвалі мясцовыя жыхары. Грашовыя сродкі збіраліся ў залежнасці ад зямельнага надзелу: была ўстаноўлена спецыяльная квота ад гектара.

У артыкуле газеты "Голас Віленскі" за № 48 ад 25 лістапада 1928 г. карэспандэнт Бернард Букатка піша: "Ксёндз Сабалеўскі за няпоўныя два гады сумеў закончыць будаўніцтва мураванага касцёла…"

З паўночна-заходняга боку касцёл мае званіцу з чатырма званамі, якія былі адліты ў Германіі. Вельмі цікавым у гэтым плане з'яўляецца артыкул парафіяніна Яна Бірука, надрукаваны ў газеце "Голас Віленскі" за № 25 ад 17 чэрвеня 1925 г.: "У пятніцу, 28 мая, адбылася ў нас урачыстасць, прысвечаная асвячэнню і ахрышчэнню званоў. Асвяціў званы наш Архіпастыр – мітрапаліт Віленскі Рамуальд Ялбжыкоўскі. Першы, самы вялікі звон, адліты на сродкі парафіян, атрымаў назву "Бернардэм", другі – меншы, зроблены на сродкі п. Фердынанда Эйсманта – атрымаў імя "Францішак", трэці, зроблены на сродкі ксяндза Юзафа Сабалеўскага, – "Юзаф", чацвёрты застаўся з старога касцёла – "Рыгор", і, нарэшце, пяты, найменшы, – "Павел".

Такім чынам, план будаўніцтва Крупаўскага касцёла быў зроблены ў 1922 г., а грунтуючыся на звестках газеты "Голас Віленскі", можна сцвярджаць, што будаўніцтва пачалося каля 1926 г. і завяршылася ў 1928 г.

Крупаўскі касцёл Святой Троіцы ўнікальны па сваёй архітэктуры, выкананы ў неараманскім стылі з драўлянай паўкруглай столлю [1].

Мая праца – гэта спроба стварыць своеасаблівы пантэон страчаных помнікаў палацава-сядзібнага дойлідства, збор звестак пра тыя архітэктурна-паркавыя каштоўнасці, што калісьці ўпрыгожвалі нашу зямлю, узбагачалі нацыянальную мастацкую і духоўную культуру, вырашэнне спрэчных пытанняў гісторыі роднай Бацькаўшчыны, адкрыццё новых сусветна вядомых імён нашых землякоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Г і в о й н а, І. З гісторыі Крупаўскага касцёла / І. Гівойна // Лідскі летапісец. – 2001. – № 4. – С. 16–18.

2. Памяць: Ліда. Лідскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Беларусь, 2004.

УДК 808.26(072)

**Гаршоў У. Дз., Сафрон Я. Дз.** – студэнты

## ПРАДМЕТЫ ХАТНЯГА ЎЖЫТКУ Ў ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАГА СЕЛЯНІНА

*Навуковы кіраўнік* – ***Дабіжы С. П.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Гаспадарка беларускага селяніна не магла абысціся без неабходных бытавых рэчаў. Зараз яны ў вёсках амаль не сустракаюцца, бо іх замянілі на сучасныя, купленыя ў краме. Але раней многія рэчы хатняга ўжытку рабіліся самімі сялянамі альбо набываліся на кірмашах у рамеснікаў. Гэта перш за ўсё посуд і прылады працы.

У беларускай хаце абавязкова былі *стол, услон, зэдлік, тапчан, куфры, люлька, лавы, полкі, палаці.*

*Услон* уяўляў сабою невялікую пераносную лавачку, зробленую з тоўстай дошкі на ножках, даволі часта з расколатага куска дрэва з чатырма роўна падпіленымі сукамі, якія і былі ножкамі. *Зэдлік* – гэта разнавіднасць лаўкі з карэнішча ці камля дрэва з 3–4 адгалінаваннямі-ножкамі і круглым ці квадратным сядзеннем, а *тапчан* – шырокая драўляная лава на ножках, ці казлах, на якой сядзелі ці спалі. *Лава* –

масіўная доўгая шырокая дошка, замацаваная на калодках ці ножках. У хаце былі звычайна дзве нерухомыя лавы ўздоўж сцен, якія сыходзіліся у чырвоным куце. Цікава, што менавіта там звычайна стаяла дзяжа з цестам. З другой паловы 19 ст. у заможных сялянскіх хатах з'явілася *канапа* – шырокае драўлянае сядзенне даўжынёй да двух метраў на чатырох ножках, з падлакотнікамі і спінкай. Канапу багата аздаблялі разьбой. Пазней сталі вырабляць *шлябаны* – канапы з сядзеннем-куфрам. *Палаці* – гэта насціл з дошак, на якім спалі. Мацаваліся палаці каля печы на ўзроўні ляжанкі на гарызантальнай рэйцы, прыбітай да сцяны хаты.

*Кубел* выкарыстоўваўся для адзення і палатна. У невялікіх *кубельчыках* трымалі сала і мяса. Кубел накрываўся векам, прыціскаўся засаўкай. Быў спецыяльны кубел для нявесцінага пасагу. Пазней кубел замяніўся *куфрам* і зусім знік з ужытку. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі ў 19 ст. атрымалі куфры для бялізны. Важную ролю куфар адыгрываў у вясельным абрадзе. Яшчэ задоўга да вяселля дзяўчына набывала сабе куфар і збірала ў яго свой пасаг: посцілкі, ручнікі, абрусы, сарочкі, андаракі і іншыя хатнія вырабы. У час вяселля, калі нявеста пераязджала да жаніха, куфар урачыста перавозіўся ў якасці пасагу ўслед за маладымі. Вядома, што на ўпрыгожванне куфра звярталася вялікая ўвага. Як правіла, ён увесь распісваўся раслінным ці геаметрычным арнаментам.

*Люльку* для немаўлят плялі з лазовых дубцоў, ракіты або рабілі з дошак і рэек. Люльку на вяроўцы падвешвалі пад столь. У канцы 19 ст. з'явілася люлька на ножках з дугападобнымі брускамі.

Пэўная роля ў прадметах хатняга ужытку адводзілася посуду.

Для захоўвання посуду служыла *паліца* – прымацаваная да сцяны дошка з бакавой сценкай, іншы раз у некалькі ярусаў уздоўж сцяны ад вугла да дзвярэй.

*Гаршчок* у традыцыйнай беларускай культуры з'яўляецца зборнай назвай для разнастайных керамічных сасудаў з шырокім горлам, галоўным чынам кухонных. Форма іх ідэальна прыстасавана для рускай печкі. Памеры гаршкоў рознага прызначэння вар'іраваліся ад аб'ёму – на 200–300 г кашы да двухвядзёрных. Гаршкі не мелі арнаменту, зрэдку ўпрыгожваліся кругавымі прамымі або хвалістымі палоскамі, а таксама радамі ямачак вакол вянца і на плечыках. Выкарыстоўвалася і свінцовая паліва. *Збан* (*гладышка*) – гліняная пасудзіна для вадкасці з ручкай і носікам, часцей за ўсё акруглай формы. *Гірка* – адбітая гладышка. Без *баклагі* – двухдоннай бочачкі – у

гаспадарцы не абыходзіліся, выкарыстоўвалі для вады. Рабілі іх з дубовых ці яловых клёпак. Баклага звычайна вісела ў хаце на цвіку. Ежу ў час жніва ці сенакосу насілі звычайна ў *спарышы* – гліняным посудзе з двух або трох гаршкоў з накрыўкамі, змацаваных ручкай. *Барылка* – бочка на 5–10 літраў, у ёй звычайна насілі ваду на сенакос. *Гляк* – выпуклая пасудзіна з вузкім горлам, плоскім дном, з адным або двума вушкамі. У гляках насілі ваду ў поле, настойвалі лекавыя расліны, захоўвалі алей. Крыху адрозніваўся ад гляка з*бан* – высокі посуд з выпуклым бокам, крышачку завужаным горлышкам, з носікам і ручкай. У жбан уваходзіла ад паўлітра да васьмі літраў вадкасці. У кожнай хаце стаяла *дзяжа* – посуд для прыгатавання цеста. Зверху дзяжа была крыху завужаная, яна закрывалася крышкай, зробленай з дошак, змацаваных лубяным абручам. *Маслабойка* – высокая, завужаная пад верх бочачка, у крышцы адтуліна для калатоўкі (біла), да ніжняй часткі якой прымацоўвалі кружок з адтулінамі або крыжавіну.

Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, асаблівым убранствам беларуская хата не адрознівалася. Але кожная рэч мела сваё месца ў хаце, вызначанае шматгадовымі традыцыямі.

ЛІТАРАТУРА

1. Б а х а н ь к о ў, А. Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А. Я. Баханькоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 450 с.
2. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: У 5 т. – Т. 3: Чалавек / Г. У. Арашонкава, М. В. Бірыла, А. П. Груцо [і інш.]; рэд. М. В. Бірыла, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск, 1996.

УДК 345.67
**Кашпур Т. Л.** – студент

## РЕЧИЦКИЙ ФЕНОМЕН

Научный *руководитель* – ***Гусарова Г. А.*** *– канд. ист. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия», Горки, Республика Беларусь

В городе Речица много талантливых людей, особенно личностей, которые проявили себя в сфере искусства: Михаил Кикоин – художник Парижской школы искусств, Александр Шмидт – живописец, но имя художника Александра Исачева знают во всем мире. Именно о нем я бы хотела рассказать в Год культуры – 2016. Неизвестный на родине, он более чем востребован за рубежом, где его имя известно ценителям художественной культуры. Не признанный современниками, Исачев

был позже назван «лучшим рисовальщиком мира». За 32 года жизни он написал около 600 работ, большинство из которых находятся в частных коллекциях за рубежом. Они не лежат в запасниках, а демонстрируются на различных выставках, издаются роскошными альбомами.

Живя в городе Речице, я училась в художественной школе. Посещая краеведческий музей, впервые познакомилась с творчеством Александра Исачева на выставке, которая была приурочена к его 60-летию. Уведенные работы произвели на меня неизгладимое впечатление, так как представляли собой необычное восприятие художником представленных тем. Они были настолько реалистичны, что чувствовалось ощущение реального существования тех, кого он писал.

Судьба художника его не баловала. Родившись в деревне Озаричи Калинковичского района Гомельской области 11 января 1955 г. в небогатой семье, он с детства познал трудности жизни, и, возможно, это дало ему потом силы выстоять в трудных ситуациях, при отсутствии признания его художественного дара. В трехлетнем возрасте Александр вместе с матерью и братьями переезжает в Речицу. Затем была учеба в Мозыре, Минской республиканской школе-интернате по музыке и изобразительному искусству. Среднее образование Исачев получил в школе рабочей молодежи Речицы.

Желание познакомиться с развитием живописи привело его в 18 лет в Ленинград. Александр устраивается на работу, получает лимитную прописку и вскоре попадает в среду неформальной творческой молодежи. Время это оказало решающее воздействие на выбор дальнейшего пути. Семидесятые годы в СССР отмечены всплеском неформального искусства. Пробыв в Ленинграде почти весь 1973 г., Саша вернулся в Речицу. Его жизнь могла войти в нормальное русло, прояви люди, от которых зависела судьба Александра, хотя бы чуточку неравнодушия, доброжелательности. Но устроиться на работу в соответствии с призванием он не смог. Александра приняли только чернорабочим на стройку. В этот сложный период он не оставляет попыток проявить себя, показать свое видение мира, и это приводит его к участию в двух официальных ленинградских выставках художников нетрадиционных направлений, которые состоялись в ДК имени Газа и ДК «Невский».

Религия становится важной темой его творчества. Язык христианской культуры был для Исачева тем средством, с помощью которого он, открывая самого себя, приобщался к культуре, учился постигать

истины человеческого бытия. В сюжетах многих его полотен отражены библейские темы: «Благовещение», «Что есть истина», «Распятие», «Андрей Первозванный», «Ной», «Апостол Петр». Особый успех имели его работы «Моисей» и «Рахиль» (обе написаны в 1976 г.). Сюжеты его картин потрясали реалистичностью, игрой красок, и складывалось впечатление твоей сопричастности к представленным пророкам. Особенно поражали глаза, которые притягивали каждого из нас к вере и истине. Увлекали художника символика Египта, Индии, мифы и легенды Греции и Рима, дохристинская культура («Аполлон и Душа», «Вдохновение», «Аллегория искусства»). В полотнах Исачева боги различных религий соседствуют друг с другом и зачастую атрибутика нескольких культур присутствует на одном холсте («Аллегория искусства»).

Александр нашел свой почерк и работал в манере гладкого письма, самостоятельно разгадывая секреты нанесения на холст тончайших слоев. Акварельная живопись, пастель, графика были ему интересны. Один из центральных образов в творчестве художника – Иисус Христос. Это не только конкретная историческая личность и главный персонаж христианских сказаний. Это любой, кто дерзнул добровольно надеть на себя терновый венец мученика, выпить «чашу сию», дабы человечество прозрело и обрело истину. Внутреннему ощущению художника более всего соответствует образ Христа – учителя, пророка – работа «Иисус Христос», или «Учитель». На картине отсутствует всякая атрибутика, символика.

А. Исачеву были интересны другие жанры искусства, такие, как пейзажи, портреты, однако они мифологизированы, о чём свидетельствуют названия работ: «Моя земля», «Да возвеселятся Небеса, да радуется Земля!», «Лунный пейзаж», «После потопа», «Моисей», «Иосиф», «Рахиль», «Пророк», «Апостол Пётр», «Ной». Поэтому неудивительно, что творчеством Исачева заинтересовалась церковь. Последовало приглашение оформить несколько храмов. Для Александра это было очень важно, так как давало возможность проявить себя, показать свое искусство и заработать на жизнь. В этот период жизни Александр расписал церковь в Мозыре, выполнял заказы по написанию икон для храмов Речицы.

2 декабря 1987 г. состоялась первая и единственная прижизненная выставка Исачева в Речице, которую посетили 20 тыс. человек (цифра для маленького городка немыслимая!). Через три дня художника не стало.

«Моим стихам, как драгоценным винам, настанет свой черед», – писала Марина Цветаева. К гениальным живописцам редко приходит признание при жизни. Словно Бог, наделивший талантом, бережет их от суетности мирской славы. Так произошло и с Александром Исачевым. Всемирное признание он получил только после смерти.

Свою судьбу он выбирал сам, прекрасно понимая, что за право заниматься свободным творчеством придется платить. Виновных никогда не искал, так как относился к бытию по-философски: каждый играет отведенную ему Богом, жизнью и обстоятельствами роль. Он прожил короткую, драматическую, но красивую и по-своему счастливую жизнь. Прожил ее так, как хотел того сам! А этим мало кто может похвастаться.

В Речице хранят память о своем земляке, и каждый, кому интересен неординарный талант А. Исачева, может познакомиться с некоторыми его картинами в краеведческом музее.

ЛИТЕРАТУРА

1. И с а ч е в а, Н. А. Не нам его жалеть / Н. А. Исачева // Палессе. – 1997. – № 4. – С. 117–135.
2. Материалы Речицкого краеведческого музея.

УДК 316.422

**Ковальков Д. В.** – студент

## ЗНАЧЕНИЕ АГРОТУРИЗМА В РАЗВИТИИ СЕЛЬСКИХ ТЕРРИТОРИЙ БЕЛАРУСИ

*Научный руководитель – **Блохин В. Н.** – ст. преподаватель*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия», Горки, Беларусь

Для прекращения разрушения регионального экономического потенциала сельских территорий Беларуси необходимо максимальное сближение показателей финансово-экономической устойчивости и экономической безопасности любых видов деятельности и жизни населения. Принципиальная возможность такого совмещения связана с высокой коррелированностью показателей продуктивности ресурсов и устойчивости экономики [4, с. 197].

Одним из важных элементов социальной политики и вообще устойчивого развития белорусского села должно стать развитие регионального агротуризма. Агротуризм предоставляет перспективные возможности развития в условиях многочисленных проблем, а то и упад-

ка традиционных видов экономической деятельности на сельских территориях [2, с. 134].

Географическое положение Беларуси (между Российской Федерацией и Европейским союзом) создает ряд серьезных преимуществ. Использование данных преимуществ невозможно без активизации трансграничных связей, обеспечивающих обмен туристическими потоками с соседними регионами и зарубежными странами [3, с. 47].

Устойчивое развитие агротуризма – это система взглядов на обеспечение условий для развития агротуристического комплекса (сельского хозяйства, социальной сферы села и туризма) как конкурентоспособной и высокоэффективной сферы деятельности региональной экономики, имеющей положительное социокультурное значение для местного населения и общества в целом.

Для обеспечения развития агротуризма необходимо соблюдение следующих принципов:

– принцип экологичности, понимаемый как стремление оптимизировать механизмы сохранения и восстановления природной и социокультурной окружающей среды при ведении сельскохозяйственной и туристской деятельности, приносящей совокупный доход;

– принцип эффективности функционирования сельского (аграрного) туристского комплекса на единстве спроса и предложения на агротуристскую продукцию;

– принцип социального партнерства власти – бизнеса – местного населения, ориентированного на создание регионального агротурпродукта.

Мировой опыт показывает, что в Беларуси развитие сельского туризма может быть эффективным как с социальной, так и с экономической точки зрения. В то же время следует иметь в виду, что максимального эффекта можно добиться, если сельский туризм будет развиваться не спонтанно, а в рамках какой-либо программы государственного, межрегионального или регионального значения. В противном случае локальные проекты в сфере сельского туризма в современных условиях недостатка финансовых ресурсов обречены на медленное и трудное самостоятельное развитие [2, с. 138].

Европейская практика подтверждает, что развитие туризма в форме малого семейного гостиничного бизнеса является крупной социально-экономической программой по переводу части аграрного населения из сферы производства в сферу услуг. Ее задача – дать импульс развитию

аграрных регионов и их населения путем организации нового специфического сектора местной экономики.

В Беларуси в 2006 г. был принят Указ Президента № 372 «О мерах по развитию агротуризма в Республике Беларусь», согласно которому была установлена минимальная налоговая нагрузка на агроусадьбы. Создание льготных условий для тех, кто работает в этой сфере, позволило увеличить количество агроусадеб в десятки раз: если в 2006 г. функционировали 34 агроусадьбы, в 2010 г. – 1247, то в 2015 г. – 2263. При этом количество принятых ими агротуристов выросло до 120 тыс. человек в год. В 2012 г. был принят указ № 432, направленный на создание дополнительных условий для развития ремесленной деятельности, стимулирования самозанятости населения [1, с. 30].

Необходимо отметить, что одним из направлений, способствующим дальнейшему развитию и повышению конкурентоспособности сельских территорий, является формирование собственных информационных пространств и программ продвижения. Продвижение сельской территории позволяет повысить информированность о территории, создать притягательность и привлекательность сосредоточенных на территории ресурсов, условий жизнедеятельности и деловой активности.

Таким образом, важнейшим направлением стратегии устойчивого развития сельских территорий должен быть экономический рост, движущей силой – конкуренция, побуждающая обеспечивать инновациями воспроизводство всех элементов системы, а регулирующая функция должна принадлежать государству. Важной задачей для Беларуси остается диверсификация экономики. Развитие агротуристической отрасли является в настоящее время перспективным направлением, услуги агроусадьб и сопутствующий сервис имеют спрос и высокий потенциал дальнейшего развития. Реализация положений государственных программ поддержки туризма позволит изменить структуру занятости и доходов приграничного населения, что положительно повлияет на качество жизни, будет способствовать развитию человеческого капитала.

ЛИТЕРАТУРА

1. В о л к о в, С. К. Сельский туризм в РФ: тенденции и перспективы развития / С. К. Волков // Экономика, предпринимательство и право. – 2012. – № 6 (17). – С. 30–38.

2. З д о р о в, М. А. Концепция устойчивого развития аграрного туризма в структуре сельских территорий России / М. А. Здоров // Труды вольного экономического общества России. – 2011. – Т. 149. – С. 132–141.

3. Российско-белорусское приграничье: двадцать лет перемен / Смол. гуманитарный ун-т; под ред. А. П. Катровского и Ю. П. Ковалева. – Смоленск: Универсум, 2012. – 288 с.
4. Т у р г а н о в а, Л. В. Разработка модели устойчивого развития региона через диверсификацию экономики / Л. В. Турганова // Труды вольного экономического общества России. – 2012. – Т. 150. – С. 189–199.

УДК 94:476 (392.1:392.8)
**Константинова И. В.** – студентка
## МЕД – ПИЩА БОГОВ
*Научный руководитель – **Ю. В. Кирчук** – ст. преподаватель*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия», Горки, Республика Беларусь

Пчеловодство – один из основных промыслов славян, который насчитывает многовековую историю. Сначала мед собирали у диких пчел. Оценив его качество, человек пришел к мысли приручить пчел. Постепенно основной продукт жизнедеятельности пчел занял главенствующее место в питании славян.

Мед – символ плодородия, здоровья, благополучия, красоты, счастья, «сладости» жизни; символ чистоты, Божьего слова, вдохновения, красноречия и поэзии. Мед приравнивался к блаженству Нирваны в Индии и к райским наслаждениям в Китае и на Западе. Он считался первозданно чистой священной пищей и служил приношением высшим божествам.

Согласно одной из древнегреческих легенд, пчела появилась на земле благодаря богине плодородия и земледелия, Деметре. Она посвятила одну из жриц своего храма, старушку Мелиссу, в тайны богов, но соседки узнали об этом и начали донимать Мелиссу расспросами. Та отказалась выдать доверенную ей тайну. От бессилия и злобы жестокие женщины растерзали старуху. Узнав о случившемся, Деметра покарала преступниц, а останки своей верной жрицы превратила в пчел, которые разлетелись по земле и с тех пор кочуют от цветка к цветку, собирая пыльцу и нектар.

Люди в древности верили, что секрет силы, бессмертия и вечной молодости жителей Олимпа заключается в пище, а питались боги, как известно, нектаром и амброзией. Никому доподлинно не известен рецепт приготовления амброзии, установлено лишь, что в разогретом меде растирались благовонные цветы и травы. О вкусе того божественного десерта мы можем лишь догадываться. А вот о его чудодейственных свойствах упоминается в тех же мифах и легендах. Ново-

рожденный Зевс, бог неба, грома и молний, ведающий всем миром, был вскормлен священной козой Амальтеей на молоке и меде. Покровитель искусств и медицины, бог Аполлон, родился семимесячным, но очень быстро окреп и набрался сил благодаря тому, что питался амброзией. Поэты, философы, врачи, мыслители, бесстрашные рыцари и воины средневековья тоже использовали мед как калорийный, вкусный продукт и как универсальное лекарство.

На Руси пчелы упоминаются впервые в 945 г. В те времена медом платили даже налоги. Пчелиным воском и медом расплачивались с иноземцами. Новобрачным дарили бочонок с медом, который те должны были опустошить за месяц. Перед новосельем медом обмазывали углы в избе. Раньше собирали мед, выдалбливая борти в стволах деревьев и приманивая диких пчел. Бортников, имевших более 100 ульев, побаивались: считалось, что те водят дружбу с нечистой силой (верили, что пчёлы родились под рукой водяного, в болотах). Бортников уважали, а укравшего у них мед клеймили позорным прозвищем «пчелодер» [1].

Мед – продукт, имеющий широкое ритуальное применение. В свадебной и родинной обрядности мед символизировал плодовитость и «сладкую» жизнь. Каравай мазали сверху медом, замешивали для него тесто в корыте, смазанном медом, добавляли мед в тесто. Во время свадьбы угощали медом новобрачных, мазали медом губы жениху и свекрови, лоб дружкам и подружкам, чтобы они скорее вступили в брак; медом и маслом на свадьбе мазали притолоку и косяки дверей. В южных регионах Беларуси молодых встречали на пороге дома с хлебом-солью и медом; на свадьбе молодым кричали «горько», но при этом мазали губы медом, чтобы жизнь была сладкой; еще в средние века при расчесывании волос молодых их обязательно мазали медом; а время после свадьбы называли «медовым месяцем».

Мед применяется при поминовении умерших т. к. он считается любимой пищей душ умерших. В похоронной обрядности мед едят как самостоятельное блюдо – с ним готовят кутью, коливо, канун (хлеб, накрошенный в воду, подслащенную медом), сыту (разведенный в воде мед), кисель, мажут медом блины, ритуальные хлебы и лепешки, добавляют мед в пиво и брагу. У восточных славян первый горячий блин, смазанный медом, клали на лавку в головах умершего, на окно или божницу. После похорон старухи всю ночь караулят душу умершего, поставив на стол сыту; верили, что душа прилетит в образе мухи и будет пить приготовленный для нее напиток [2].

Мед и медовые кушанья готовили на праздники, связанные с культом предков: на святках, особенно в Сочельник, на Рождество, на Пасху, в Страстной четверг, на Вознесение, Троицу и др. Практически на всех праздниках использовали «медовуху» – мед, разведенный водой.

У белорусов на Радуницу поливали могилы водкой и медовой сытой.

Мед с рождественского стола хранили весь год, т. к. он обладал лечебными и апотропейными свойствами: им лечили горло, ожоги, раны, мазали новокупленную скотину, чтобы она хорошо велась (словац., хорват.); давали стельной корове. По мнению болгар, мед способен отвращать магию, сглаз. Верили, что мед оберегает от змеиных укусов. Поэтому мед или хлеб с медом ели натощак сами и давали скоту в Вербное воскресенье или Страстной четверг; давали скоту в Сочельник; мазали медом и маслом вымя и морду коровам; мазали медом лоб всем домочадцам ради оберега и т. д.

У русских мед жертвовали св. Илье, в Ильин день пасечники угощали всех медом. У болгар медом мазали рот жертвенного барашка, предназначенного для св. Георгия; на Руси – голову лошади, приносимой в дар водяному.

Мед издавна стал символом «сладости», благосостояния, высокого уровня жизни. Если человек использовал в своей пище мед, значит, жизнь его протекала благополучно.

О целебных свойствах продуктов пчеловодства известно с давних времен. Не только народная, но и современная научная медицина пользуется медом при лечении различных заболеваний. Мед восстанавливает и придает силы, мобилизует защитные функции организма, поднимает иммунитет. Гиппократ, который широко применял мед в лечебной практике, советовал употреблять его ежедневно. Мед, по мнению японских медиков, – царь натуральных продуктов, благотворно влияющих на организм человека.

Еще в древности люди замечали, что охотники за диким медом не страдали заболеваниями суставов, сосудистой системы, обладали хорошим здоровьем и были долгожителями. И, как ни странно, это происходило оттого, что их часто жалили пчелы. Пчелиный яд оказался отличным лекарством. Народная медицина издавна применяла пчелиные укусы при лечении ревматических и других болезней, связанных с простудой. Пчелиный яд эффективным оказался также при лечении заболеваний нервной системы и при изменениях сердечной мышцы. Он снижает и воспалительные процессы. В народе говорят о пчелах:

«Кого жалят, того и жалуют». Из глубины веков дошло до нас и другое изречение: когда человеку желали здоровья, часто говорили: «Да ужалит вас пчела».

В народной медицине мед использовали при лечении заболеваний желудка, печени, гнойных ран, как жаропонижающее и отхаркивающее средство. Им лечили раны, острые и хронические болезни внутреннего происхождения, он был незаменим при истощении, слабости и просто при усталости. В одном медицинском трактате было записано: «Мед оздоравливает все внутренние органы, поддерживает силу, снимает жар. Длительное его употребление укрепляет волю, придает легкость телу, сохраняет молодость, продлевает годы жизни». Имеются исторические данные, что во время войн, когда не было медикаментов, на раны накладывали повязки с медом, и раны без осложнений заживали.

Этот источник сил и здоровья вобрал в себя более ста веществ, жизненно важных для организма человека. Помимо огромного числа полезных, лечебных свойств, мед содержит так называемый эргогенный компонент (элемент, повышающий работоспособность). В Японии, например, об этом знают и дают школьникам до 14 лет по ложке меда бесплатно. Совсем недавно ученые пришли к выводу, что лучшее средство, сохраняющее, а иногда и восстанавливающее зрение, – это не черника, а мед. А несколько ложек дронникового или липового меда – прекрасная защита от пагубного излучения монитора, которое вредит не только глазам, но и организму в целом [1].

Мед можно назвать удивительным природным лекарством, оказывающим неповторимое воздействие на организм человека. Употребляя мед, вы делаете свой организм здоровее, а здоровье – крепче, тело – моложе. Ежедневное употребление меда принесет намного больше пользы, чем многие другие продукты.

ЛИТЕРАТУРА

1. Мёд – дар, горящий златом! [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://slavyane.org/earht/mjod-dar-goryashchij-zlatom.html. – Дата доступа: 05.03.2016.

2. Пчелиный мёд [Электронный ресурс] // Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Пчелиный_мёд#.D0.9C.D1.91.D0.B4_.D0.B2_.D0.BA.D1.83.D0.BB.D1.8C.D1.82.D1.83.D1.80.D0.B5. – Дата доступа: 05.03.2016.

УДК 351.853.1

**Коржыч А. А.** – студэнт

**СВЯТА-ТРАЕЦКІ САБОР У г. п. ХОЦІМСК – ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX ст.**

*Навуковы кіраўнік* – ***Куніцкая А. М.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Сёння Хоцімск – звычайны беларускі гарадок, у якім пражываюць каля 6,5 тыс. чалавек. Чысценькі, дагледжаны, з прыгожымі скверамі і паркам адпачынку, ёсць нават кола агляду, утульныя кавярні, дзе вас пачастуюць смачнымі абаранкамі. Незвычайна шмат тут дрэў і рознакаляровых кветак. Некалькі брацкіх магіл і помнікаў у цэнтры пасёлка. І яшчэ ёсць у Хоцімску храм – Свята-Траецкі сабор, які з'яўляецца сапраўдным упрыгожваннем горада.

Свята-Траецкі сабор – помнік архітэктуры другой паловы XIX ст. – пабудаваны на сродкі мясцовых жыхароў у гонар адмены прыгоннага права. Будаўніцтва яго вялося 12 гадоў, а ўсе матэрыялы нарыхтоўваліся мясцовымі жыхарамі на месцы. У 1873 г. на свята Пяцідзясятніцы храм быў асвячоны архіепіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім Яўсевіем. Лёс яго падобны на лёсы многіх сабораў і цэркваў. Упершыню храм быў зачынены ў 1938 г. У двары райвыкан-кама спалілі іконы, царкву абезгаловілі, званіцу разбурылі. Затым у будынку быў размешчаны банк, потым школа механізацыі, зернясклад, раённы Дом культуры. Падчас вайны немцы ператварылі сабор у бастыён, а пасля вызвалення горада будынак доўга пуставаў. У 1954 г. яго зноў пераабсталявалі ў Дом культуры.

У 1958 г. святаром у адзіным дзеючым храме Хоцімска – Свята-Пакроўскай могілкавай царкве – стаў архімандрыт Кірыл (Бадзіч) (у той час іерэй Аляксей, 1929 года нараджэння). Нягледзячы на ўсе нягоды атэістычнага часу, святар не пераставаў хрысціцца на купалы Свята-Траецкага храма і нястомна маліўся аб адраджэнні царквы – гэтай хоцімскай жамчужыны. У 1990 г., калі будынак сабора аддалі вернікам, яго выгляд не выклікаў нічога, акрамя жалю... Вось тут і знайшлася справа айцу Кірылу: толькі за першыя 10 гадоў былі адноўлены вежы купалоў, пабудаваны дзве каплічкі, гаспадарчыя будынкі. І з таго часу нястомны пастыр збірае ахвяраванні, заняты не толькі на духоўнай ніве, але і на будаўнічай і педагагічнай. Паводле яго слоў, яшчэ многае трэба зрабіць. Клопату патрабуе і нядзельная

школа, дзякуючы якой саборны двор часта поўніцца дзіцячымі галасамі і ў якую дзеці прыходзяць і для заняткаў жывапісам і разьбярствам.

Яшчэ ў гонар 50-годдзя вызвалення Хоцімска бацюшка пабудаваў Свята-Праабражэнскую царкву, дзе кожную суботу служыць паніхіды па воінах, загінулых у гады вайны і падчас выканання воінскіх абавязкаў. У спісе, які ён склаў, больш за 11 тысяч імёнаў. Але спіс папаўняецца і зараз, а збіраць звесткі дапамагаюць ваенкамат і добраахвотныя пашукавікі.

Цікавасць ўяўляе сабой і царкоўная бібліятэка. Збіраць старадаўнія кнігі айцец Кірыл пачаў яшчэ ў гады Савецкай улады, калі за «няправільную» літаратуру маглі і пад суд аддаць. Чаго варта толькі дарэвалюцыйнае выданне «Дзённік цара Мікалая II» – два фаліянты з запіскамі цара тых гадоў, калі ён яшчэ быў цэсарэвічам і шмат падарожнічаў па Усходзе. Гэтую кніжную рэдкасць бацюшка набыў у адной з букіністычных крамаў Адэсы.

А вось кніжны рарытэт "Пчала" дастаўся яму ў спадчыну ад добрых знаёмых. Зборнік упершыню з'явіўся на Русі яшчэ ў рукапісным выглядзе, а першае яго выданне датуецца 1893 г. (Санкт-Пецярбург). "У дарэвалюцыйнай Русі на гэтую кнігу заўсёды быў попыт, – кажа святар. – Добра было б гэты зборнік перавыдаць".

Царкоўная бібліятэка ўражвае. Уздоўж сцен вялікага пакоя стаяць стэлажы, з нізу да верху запоўненыя кнігамі, часопісамі, газетамі. Літаратура на любы густ – дзіцячая, энцыклапедычная, гістарычная. Ёсць фаліянты, якія, мяркуючы па памерах, важаць як мінімум 10 кілаграмаў. А выдадзеная да рэвалюцыі ў Санкт-Пецярбургу кніга Джона Мільтана «Страчаны і вернуты рай» на выгляд і на ўсе 20 пацягне! Бацюшка беражліва пагладжвае перакладзеныя папяроснай паперай старонкі: "Гэтую кнігу Мільтан ствараў усё сваё жыццё. А калі аслеп, яго думкі запісвала дачка. Ён яе падымаў нават сярод ночы, калі раптам адчуваў натхненне. А палюбуйцеся, якія раскошныя ілюстрацыі! Аднойчы кніга знікла і гэтак жа нечакана знайшлася. Яе забраў адзін чалавек з Горак, а потым, відаць, сумленне замучыла. Сам вярнуць не адважыўся, перадаў праз прыхаджанку".

З перыёдыкі тут захаваліся часопісы Маскоўскай патрыярхіі за 1943 г. У савецкія гады бацюшка выпісваў шмат розных часопісаў – "Огонёк", "Наука и религия", "Вокруг света". Зараз яны таксама захоўваюцца ў бібліятэцы. Іх з задавальненнем гартаюць і дарослыя, і дзеці. Пасля таго як дом абакралі і вынеслі шмат рэдкіх кніг, айцец

Кірыл перадаў сваю бібліятэку нядзельнай школе. Тут яна пад надзейнай аховай.

У 2002 г. архімандрыт Кірыл (Бадзіч), настаяцель Свята-Траецкага храма, узнагароджаны прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». У 2004 г. у гонар 60-годдзя Перамогі на ахвяраванні прыхаджан і дабрачынны збор арганізацый і прадпрыемстваў быў адліты і дастаўлены ў Хоцімск звон для Свята-Траецкага сабора. Яго вага – 1280 кг. У Беларусі такі звон быў адліты ўпершыню.

У цяперашні час пры саборы дзейнічае царкоўнапрыходская школа з дзіцячым царкоўным хорам, бібліятэкай, кружкамі, створаны дарослы царкоўны хор, штогод праводзіцца калядная ёлка для дзяцей і шэраг іншых духоўна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Так, у Хоцімску 15 верасня 2015 г. прайшоў пяты фестываль праваслаўнага перазвону “Хоцімскія перазвоны”. Архімандрыту Кірылу (Бадзічу) была выказана падзяка ад Мінскага духоўнага вучылішча за працу па адраджэнні і захаванні традыцый перазвону Рускай праваслаўнай царквы і культурнай спадчыны Беларусі.

Яшчэ адно вялікае захапленне архімандрыта Кірыла – кветкі. Улетку Свята-Траецкі сабор літаральна патанае ў рознакаляровых фарбах, і нездарма ён станавіўся пераможцам у раённым спаборніцтве па добраўпарадкаванні.

Намеснік старшыні Хоцімскага райвыканкама М. Хучаў адзначыў: “Гэтага свята не было б, калі б не айцец Кірыл. Гэта наш духоўны бацька, гэта ганаровы грамадзянін Хоцімскага раёна. Таму велізарнае Вам дзякуй, айцец Кірыл, за тое, што Вы ёсць, за тое, што Вы змаглі ўвасобіць сваю мару ў жыццё. Як не было б і гэтага храма, асвечанага 16 гадоў таму таксама па волі Божай і дзякуючы велізарнай, тытанічнай працы нашага духоўнага пастыра”.

Архімандрыт Кірыл служыць у Хоцімску 57 гадоў. Выхаваў 8 прыёмных дзяцей, якія зараз працягваюць яго справу і служаць у храмах Расіі і Беларусі.

Але нічога асаблівага ў сваёй працы ён не бачыць. Кажа, што ўсё гэта заслугі Госпада. “Храм пабудаваць цяжкасцяў няма. Адрамантаваць храм душы сваёй – вось тут праца”, – лічыць ён. – Невыпадкова Ніл Сорскі казаў: “Памыслі пра Бога – і розум твой зробіцца небам”. Нягледзячы на свой узрост, айцец Кірыл бадзёры і энергічны, ён усё некуды спяшаецца па справах. Таму і такой павагай карыстаецца гэты па-манаску сціплы і па-чалавечы шчодры душою чалавек. А храм – гэта сімвал яшчэ адной перамогі – духоўнай.

Сёння, і пра гэта трэба гаварыць з належнымі разуменнем і гонарам, менавіта заслуга архімандрыта ў тым, што Хоцімск стаў адным з цэнтрам праваслаўя Магілёўшчыны. Свята-Траецкі сабор, які адноўлены быў працай і малітвамі бацюшкі, стаў цэнтрам адраджэння маральнасці, надзеі і веры, а рэспубліканскі фестываль звону збірае вернікаў з усяго прыгранічнага наваколля Беларусі і Расіі.

Свята-Траецкі сабор ўваходзіць у спіс гісторыка-культурнай помнікаў Рэспублікі Беларусь. Яго званіца з 12 званамі з'яўляецца адной з найлепшых у Беларусі, а таксама не мае аналагаў у суседніх рэгіёнах Расіі.

ЛІТАРАТУРА

1. З і г у л я, Н. У госці да бацюшкі / Н. Зігуля // Шлях Кастрычніка. – 2013. – 16 ліст.

2. З і г у л я, Н. Храм лёсу архімандрыта Кірыла / Н. Зігуля // Шлях Кастрычніка. – 2010. – 24 крас.

3. І в а н о в а, І. У Хоцімску прайшоў фестываль перазвону / І. Іванова // Шлях Кастрычніка.

4. Hotimsk. Дата доступу: 25. 03.2016.

УДК 811.161.3

**Крупская В. А.** – студэнтка

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА І АДУКАЦЫЯ

*Навуковы кіраўнік* – ***Скікевіч Т. І.*** *– канд. філал. навук, дацэнт*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Ад пакалення да пакалення беларускі народ замацоўваў у слове сваё бачанне свету, свой вопыт пазнання, ад эпохі да эпохі ён выпрацоўваў разнастайныя сродкі для перадачы думак, пачуццяў. Прыродныя ўмовы і геаграфія краіны, узровень народнай гаспадаркі і кантакты з іншымі народамі, характар грамадскай думкі, культуры, мастацтва – усе вялікія і малыя асаблівасці жыцця нашага народа адлюстраваліся ў мове.

Моўная культура беларускага народа надзвычай багатая і самабытная. Яна ўвасоблена ў поўных чароўнага хараства песнях, у афарбаваных міфічнасцю легендах, паданнях і дасціпных, мудрых прыказках, у адмысловых загадках. Гэтыя моўныя скарбы раскрываюць нам гісторыю народа, сведчаць пра яго сацыяльны інтэлект, далучаюць нас да маральных каштоўнасцей, створаных народам за стагоддзі, дапамагаюць зразумець яго філасофію, мастацкія вобразы, авалодаць сакрэтамі

яго моватворчай дзейнасці. Захоўваючы духоўную спадчыну народа, замацоўваючы ў слове ўсё тое, што прынята называць культурай, мова яднае нашчадкаў і продкаў, звязвае мінулае з сучасным і будучым.

Але ў цяперашні час у нашай краіне склалася вельмі складаная сітуацыя ў адносінах да беларускай мовы. Так, паводле перапісу 2009 г., 80,2 % беларусаў і 65 % усяго насельніцтва Беларусі лічаць сваёй роднай мовай беларускую. Гэта азначае, што этнічная функцыя пераважае ў беларускай мовы над камунікатыўнай. У сілу пэўных гістарычных, сацыяльных і геапалітычных прычын для большасці жыхароў Беларусі гэтую ролю выконвае руская мова, а беларуская мова не стала пакуль асноўным і адзіным сродкам камунікацыі ў нашай рэспубліцы.

У павелічэнні колькасці людзей, якія б выкарыстоўвалі беларускую мову ў розных сферах жыцця, вельмі важнае месца займае сістэма адукацыі розных узроўняў. Важна забяспечыць непарыўнасць беларускамоўнага навучальнага працэсу на працягу ўсяго перыяду навучання: ад садка і да ўніверсітэта. Для гэтага трэба мабілізаваць усе структуры, якія павінны забяспечваць непарыўнасць працэсу.

Неабходна наладзіць сістэму падтрымкі і ўзаемадзеяння паміж галоўнымі ўдзельнікамі працэсу папулярызацыі беларускай мовы (беларускімі школамі, бацькоўскімі камітэтамі і інш.), каб яны не заставаліся сам-насам са сваімі праблемамі.

Павінна быць забяспечана магчымасць навучання дзяцей і моладзі розным прадметам на беларускай мове ў межах адукацыйнай сістэмы, уключаючы дашкольнае выхаванне, сярэднюю адукацыю, спецыяльную і вышэйшую адукацыю.

Першая, хоць і не абавязковая, прыступка адукацыі – дзіцячыя садкі. У іх ходзяць кожныя тры з чатырох маленькіх беларусаў. За кошт дэмаграфічнага ўздыму ў апошнія гады колькасць дзяцей у садках павялічылася. Аднак колькасць тых, хто займаецца па-беларуску, скарацілася на 6100 чалавек.

У школах паказчыкі не такія нізкія, але нават на такім узроўні беларускамоўнасць трымаецца толькі за кошт вясковых школ. Сярод 135 тысяч беларускамоўных школьнікаў толькі 14 500 вучацца ў гарадах. Колькасць беларускіх і рускіх школ, якія ёсць у Беларусі (на 2014–2015 нав. год), прадстаўлена ў табліцы.

| Рэгіён | Колькасць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляецца | |
|---|---|---|
| | На беларускай мове | На рускай мове |
| Брэсцкая вобласць | 275 | 254 |
| Віцебская вобласць | 234 | 239 |
| Гомельская вобласць | 258 | 293 |
| Гродзенская вобласць | 225 | 122 |
| Мінская вобласць | 349 | 190 |
| Магілёўская вобласць | 194 | 193 |
| г. Мінск | 11 | 229 |
| Рэспубліканскія ўстановы | 1 | 3 |
| Усяго | 1547 | 1523 |

З табліцы мы бачым, што на тэрыторыі Беларусі ў розных абласцях ёсць школы як на беларускай мове, так і на рускай. У Мінску доля стабільна нізкая – школ з беларускай мовай навучання ўсяго 11, а з рускай – 229. На Міншчыне ў 2010 г. па-беларуску навучалася кожнае трэцяе дзіця. Цяпер – кожнае чацвёртае. У абласцях адбываецца імклівае скарачэнне, але агульная колькасць школ на беларускай мове перавышае колькасць школ на рускай мове. Для ўсходняй Беларусі беларускамоўная адукацыя скарацілася з 17–18 % да 12–13 %.

Падобная сітуацыя і ў вышэйшай адукацыі. Паводле статыстыкі, па-руску і па-беларуску навучаюцца 149 200 чалавек (41,1 %). Але ў лік іх уваходзяць студэнты, у якіх па-беларуску можа чытацца толькі адзін нейкі курс.

На беларускай жа мове навучаюцца ўсяго 300 чалавек, фактычна гэта толькі філалагічныя групы і нешматлікія групы гістфака. За пяцігодку лічба зменшылася ў 6 разоў.

Таксама стан беларускай мовы мы можам убачыць з колькасці людзей, якія здавалі на цэнтралізаваным тэставанні беларускую мову. Па дадзеных 2013 г., на цэнтралізаванае тэставанне зарэгістраваліся 117 768 чалавек. Усе апошнія пяць гадоў гэтая лічба няўхільна скарачалася. У 2012 г. ЦТ па беларускай мове абралі 32 %, у 2011 г. – 35 %, у 2010 г. – 39 %, у 2009 г. – 37 %, у 2008 г. – 42 %.

Такім чынам, колькасць людзей, якія здавалі рускую мову, значна большая, чым тых, што здавалі беларускую мову. У 2013 г. на рускую мову зарэгістравалася ў два з паловай разы больш, чым на беларускую. І гэта з’яўляецца вельмі трывожным, бо ў пачатку 2000-х гг. дзве дзяржаўныя мовы дзялілі абітурыентаў пароўну. Потым суадносіны паступова сталі змяняцца не на карысць беларускай мовы. Гэта звязана з тым, што ўсё менш дзяцей навучаецца на беларускай мове, усе менш людзі карыстаюцца роднай мовай.

У той жа час ёсць частка абітурыентаў, якія прынцыпова здаюць ЦТ па ўсіх прадметах на беларускай мове. Найбольшы паказчык тут па гісторыі Белурусі – 19 %, матэматыка і фізіка – па 5 %, геаграфія – 4,5 %, грамадазнаўства – 2 %.

Такім чынам, на нашу думку, для ажыццяўлення новых прагрэсіўных крокаў у засваенні і ўдасканаленні роднай мовы на народна-нацыянальнай моўнай аснове сёння неабходна дасканала засвоіць папярэднюю моўную спадчыну беларускай мовы, тады ўзмацніцца надзея на выкарыстанне беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай нароўні з рускай мовай.

Акрамя таго, каб спыніць далейшы заняпад беларускай мовы і вярнуць ёй належны статус, неабходна вызначыць межы і месца рускай мовы ў сістэме адукацыі, грамадскага кіравання, выдавецкай дзейнасці, СМІ і іншых інфармацыйных сферах. Колькасць рускамоўных дзяржаўных устаноў не павінна перавышаць 15–20 %, уключаючы рускамоўныя школы, зыходзячы з колькасці рускага насельніцтва і грамадзян небеларускага паходжання, якія стала карыстаюцца рускай моваю.

Занядбалы сучасны стан беларускай мовы – гэта вельмі моцны сігнал небяспекі для ўсяго беларускага народа. І наш народ павінен тэрмінова адрэагаваць, каб захаваць свае нацыянальныя і культурныя здабыткі і застацца жыццядзейным.

ЛІТАРАТУРА

1. 1. Доля беларускай мовы на ЦТ зніжаецца, але ёсць тыя, хто здае ўсё па-беларуску [Электронны рэсурс]. 04.06.2013. – Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/news/13133. – Дата доступу: 30.06.2016.

2. Т р у с а ў, А. Русіфікацыя беларускай мовы на Беларусі / А. Трусаў [Электронны рэсурс]. – 29.06.2015. – Рэжым доступу: tbm-mova.by/news_1203.html. – Дата доступу: 30.06.2016.

УДК 940.5(092)

**Лукьянова Б. С.** – студентка

# ПАЛИТРА МАСТЕРА НАТЮРМОРТА, ИНТЕРЬЕРА И ПОРТРЕТА

*Научный руководитель* – ***Лукина Л. В.*** *– канд. ист. наук, доцент*
УО «Витебская государственная академия ветеринарной медицины», Витебск, Республика Беларусь

Своими натюрмортами, именуемыми в официальных документах как «живопись цветов и фруктов», в историю искусства вошел Иван (Ян) Фомич (Томашевич) Хруцкий (1810–1883 гг.). Шляхтич герба Лелива родился в местечке Улла Лепельского уезда Витебской губернии, получил первоначальное художественное образование в Полоцком высшем пиарском училище. Это учебное заведение с бесплатным обучением, в котором преподавали курс теологии, осваивали польский язык и литературу, математику, изучали музыку, рисование. Переехав в Санкт-Петербург в 1829 г., И. Хруцкий берет уроки у английского живописца Джорджа Доу, одновременно занимаясь в Императорской Академии художеств в качестве вольноприходящего ученика. Поступив в 1830 г. в Академию художеств, учится у таких известных мастеров кисти, как А. Г. Варнек, М. Н. Воробьев, К. П. Брюллов, Ф. А. Бруни.

Первыми датированными этюдами художника, относящимися к 1832 г., были «Натюрморт с вазой» и «Натюрморт с птичкой». Это время создания И. Хруцким сходных по стилю таких работ, как «Плоды и птичка» (1833 г.); «Фрукты» (1834 г.); «Виноград и фрукты», «Натюрморт с яблоками, виноградом и лимоном», которые отличались композиционной простотой. Несколько позже мастер в своем творчестве будет создавать уже более значительные по размерам натюрморты-картины, представляющие собой сложные композиции, объединяющие множество разнообразных овощей, плодов и цветов: «Цветы и плоды» (1836 г., 1839 г.); «Натюрморт со свечой», «Цветы и фрукты», «Плоды, фрукты, битая дичь» (датированы 1830 гг.). В 1836 г. за картину «Цветы и плоды» И. Хруцкий был награждён академическим Советом большой серебряной медалью. Ему присвоено звание свободного художника «во внимание к хорошим сведениям в ландшафтной живописи». В 1839 г. И. Хруцкий получает звание академика по живописи плодов и птиц.

На протяжении всего творческого пути Ивана Хруцкого прослеживается и пейзажная живопись. Пейзажная палитра Ивана Хруцкого нашла свое воплощение в картинах «Вид на Елагином острове в Петербурге» (1839 г.), «Вид в имении» (1847 г.).

Во второй половине 1840-х гг. художник возвращается на родину, приобретает имение Захарничи. Он выстраивает дом по своему проекту с анфиладным расположением комнат, разбивает сад. В период с 1845 по 1855 гг. И. Хруцкий работает по заказам литовского митрополита Иосифа Семашко. Художник пишет иконы для собора Александра Невского в Ковно (1847 г.), церкви Святого Иосифа Обручника в Тринополе (1849 г.), пещерной церкви Трех Мучеников в Вильно (1850–1851 гг.), 32 портрета лиц духовного звания для архиерейского дома в Вильно. Он участвует в выпуске серии литографированных городских видов «Виленского альбома» Я. К. Вильчинского, изданно-го в Париже.

Жанровая полифоничность в творчестве художника раскрылась и в написании интерьеров, получивших название своеобразного жанра «в комнатах». Это картины «Мастерская художника», «Митрополит Иосиф Семашко слушает в своем кабинете доклад секретаря» (1854 г.), «В комнате» (1854 г.), «В комнатах усадьбы художника И. Ф. Хруцкого Захарничи» (1855 г.). Выполняет И. Хруцкий и портреты, в которых зачастую фоном служат пейзажи. Информационно-эмоционально насыщенные портреты введены в его «интерьеры», а портретное сходство усилено приемом контрастного освещения с выразительностью изображения. Таков портрет Миколая Малиновского (1855 г.) и «Автопортрет» (1884 г.), написанный за год до смерти художника. Помимо персональных изображений, И. Хруц-кий создает групповые портреты: «Семейный портрет» (1854 г.) представляет зрителям мать и троих детей на фоне паркового пейзажа.

В память о выдающемся мастере натюрморта и интерьера, портретисте И. Ф. Хруцком названы улицы в Полоцке и поселке Улла, детская художественная школа в городе Новополоцке. В деревне Полота Полоцкого района Витебской области открыт школьный музей «Жизнь и творчество династии Хруцких». В рамках празднования 200-летия со дня рождения Ивана Фомича Хруцкого его имя внесено в Перечень памятных дат ЮНЕСКО 2010 г., а в 2012 г. в Новополоцке был открыт памятник.

ЛИТЕРАТУРА

1. К у з н е ц о в, С. О. Живописец Иван Хруцкий: проблема интерпретации творчества «среднего художника» XIX в. / С. О. Кузнецов // Вопросы отечественного и зарубежного искусства. Вып. 4: Проблемы изобразительного искусства XIX столетия. – Л., 1990. – С. 82–99.

2. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. – Минск: БелСЭ им. Петруся Бровки, 1985. – 496 с.

УДК 811.161.3:582

**Макарава В. А., Аўсянік Д. В.** – студэнткі

## АСАБЛІВАСЦІ НЕКАТОРЫХ БЕЛАРУСКІХ НАЗВАЎ РАСЛІН

*Навуковы кіраўнік* – ***Скікевіч Т. І.*** *– канд. філал. навук, дацэнт*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

"О Беларусь, мая шыпшына!" – звяртаўся да народа таленавіты паэт Уладзімір Дубоўка. Гаваркое слова, ці не праўда? Краіна наша сапраўды нагадвае гэтую цудоўную кветку, якая ў параўнанні з арыстакраткай-ружай асацыюецца з сялянкай у ружовай хусцінцы, але ніколькі не саступае ёй па высакароднасці.

Практычна ва ўсіх рэлігіях свету ёсць згадванні аб гэтай высакароднай і непаўторнай кветцы з далікатным водарам – ружы. Калі яна з'явілася ўпершыню і кім быў яе майстэрскі творца, дагэтуль дакладна невядома. Існуе больш за сотню розных варыянтаў, усе яны загадкавыя, больш падобныя на легенды, чым на быль, але хіба можа быць іншай біяграфія гэтай кветкі.

Аднак сэрцу ўсё ж даражэйшая свая – палявая *валошка*, якая часта застаецца непрыкметнай сярод жыта, але настолькі ўражвае сваёй натуральнай вытанчанасцю, што абрана сімвалам сінявокай краіны. Так, гэта той самы *васілёк*, які замест персідскага ўзору ткала, забыўшыся, рука Багдановічавай ткачыхі. Але ці васільком карціць назваць гэтую кветку? У скарбонцы беларускай мовы шмат аўтэнтычных назваў раслін, якія па прычыне моўнай недасведчанасці застаюцца незаўважанымі. Таму запрашаем вас прайсціся па ягадных сцяжынках, пачуць шамаценне лістоты на дрэвах і ўдыхнуць пах непаўторных беларускіх кветак.

У кожнай мове прысутнічаюць свае правілы і законы, таму, пачынаючы вывучаць новую мову, мы перш-наперш звяртаем увагу на выключэнні і несупадзенні з роднай. Параўноўваючы блізкародныя мовы, мы пераконваемся, што гэтае правіла спрацоўвае і тут. Назвы

многіх беларускіх раслін не супадаюць з назвамі рускіх у родзе і ліку. Мужчынскі род, напрыклад, маюць такія словы, як *блёкат, бружмель, бэз, гарлачык, гваздзік, падбел, рамонак,* у той час як у рускай мове яны суадносяцца з назоўнікамі жаночага роду – *белена, жимолость, сирень, кувшинка, гвоздика, мать-и-мачеха, ромашка.* Адваротную сітуацыю мы можам назіраць у назвах жаночага роду *валошка, вяргіня, каляндра, канюшына, півоня, таполя, шыпшына,* якія перакладаюцца на рускую адпаведна як *василёк, георгин, кориандр, клевер, пион, тополь, шиповник.* Верагодна, кожны з вас памятае бабульчын рэцэпт супраць прастуды: лыжачка мёду з сокам *альвасу.* Але ці многія з вас ведаюць, што гэты назоўнік адпавядае рускаму *алоэ* ніякага роду? Што ж датычыцца ліку, то несупадзенні тут назіраюцца ў назвах некаторых раслін і большасці ягад. Множнага ліку назоўнікі *багаткі, браткі, брусніцы, буякі,ваўчкі, парэчкі, чарніцы.* Рускія адпаведнікі маюць у адрозненне ад іх адзіночны лік: *молочай, иван-да-марья, брусника, голубика, череда, смородина, черника.*

Асаблівую цікавасць у назвах раслін, аднак, выклікае не граматычны, а лексічны бок. Шмат стракатых назваў прысутнічае сярод насельнікаў расліннага свету. Ёсць сярод іх назвы заматываваныя, якія лёгка тлумачацца з пункту погляду жыццёвай логікі. Менавіта да такіх адносіцца слова *падбел.* Думаю, кожны з вас бачыў або проста ведае, што лісце ў гэтай расліны мае аксаміцісты тыльны бок белага колеру. Таму назва ў дадзеным выпадку гаворыць сама за сябе. Прысутнічаюць, аднак, назвы з не вельмі яснай семантыкай, але тут на дапамогу заўсёды прыйдзе этымалагічны слоўнік. Так, мы можам даведацца, што, па адной з версій, назва *буякоў* звязваецца з дзеясловам *буяць* ‘буйна расці’. Адпаведная назва даецца гэтай ягадзе, каб адрозніць яе ад падобнай, але меншай па памерах *чарніцы.* Па іншай версіі, назва ўзыходзіць да дзеяслова *буяць* са значэннем ‘буяніць, шалець’. Гэта тлумачыцца тым, што ягады буякоў выклікаюць ап’яненне і галаўны боль. Назва *святаянніку* (рус. *зверобой*) звязваецца з тым, што цвіце гэтая расліна каля свята святога Івана, якога ў народзе клічуць проста Янам.

Пэўную цяжкасць выклікае і пераклад з рускай мовы на беларускую назваў такіх раслін, як *бессмертник, дурман, ежевика, жасмин, иван-чай, камыш, крыжовник, лютик, маргаритка, можжевельник, репейник (лопух), чабрец і чернобыльник.* У беларускай мове яны суадносяцца з такімі назвамі, як *сухацвет,*

*дурнап'ян, ажына, язмін, скрыпень, чарот, агрэст, казялец, курaслеп, стакротка, ядловец, дзядоўнік, чабор, быльнёг.*

ЛІТАРАТУРА

1. Л о б а н ь, Н. Батанічны слоўнік Зоські Верас / Н. Лобань. – Роднае слова. – 2014. – № 9. – С. 26–29.
2. Л я л ь к о, К. Ave Maria / К. Лялько. – Мінск, 1994. – С. 22.
3. http://www.usebelarusy.by/be/content/vytoki/24940/24941/25329

УДК 392.8.(476:908)
**Макарава В. А.** – студэнтка
## ХЛЕБ – АСНОЎНАЕ БАГАЦЦЕ БЕЛАРУСАЎ
*Навуковы кіраўнік – **Куніцкая А. М.** – ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Гісторыя цывілізацыі – гэта гісторыя хлеба. Чалавек і хлеб заўсёды побач. Для многіх народаў хлеб увасабляе сабой жыццё. Тысячагод-дзямі хлебароб апрацоўвае глебу, якая дае сілу каласам, а ўжо з іх вырасце зерне для хлеба. Хлеб, у сваю чаргу, дае сілу людзям. Гэты кругаварот у прыродзе паўтараецца з года ў год, з века ў век.

Спрадвеку хлеб у беларусаў быў у пашане і з'яўляўся знакам заможнасці, дабрабыту і дастатку. І па сённяшні дзень традыцыя сустракаць знакамітых і важных гасцей хлебам-соллю захоўваецца ў нашай краіне не толькі як частка ўрачыстага этыкету, але і свяшчэннай цырымоніі, якая сімвалізуе хлебасольства гаспадароў. Яна сведчыць пра іх гасціннасць, ветлівасць і адкрытасць, пра давер і гатоўнасць да ўзаемадапамогі і падтрымкі. Нездарма ў народзе кажуць: "Будзе хлеб – будзе і песня".

Пачуццё павагі да хлеба ў Беларусі, беражлівае да яго стаўленне, можна нават сказаць трапяткое, – частка культуры беларусаў. Інакш кажучы, адносіны да хлеба тут у генах. Каб яшчэ больш даведацца пра хлеб, можна наведаць музей старажытных народных рамёстваў і тэхналогій у Дудутках, што пад Мінскам, там ёсць і ўнікальная пякарня, дзе кожны, хто жадае, убачыць працэс выпечкі і пакаштуе свежыя духмяныя вырабы.

За многія стагоддзі выпрацаваліся пэўныя адносіны да хлеба. З ім звязаны шэраг народных прыкмет і павер'яў. Лічылася вялікім грахом кінуць на падлогу крошку хлеба. Калі ж выпадкова здаралася, што падаў кавалак, то яго падымалі і цалавалі, перад тым як пакласці ў рот.

Крышыць хлеб таксама забаранялася: хто так зробіць, той ніколі не будзе мець хлеба. Па хлебе прадказвалі лёс членаў сям'і. Калі бохан у печы разваліцца на дзве палавіны, гэта не на дабро: у тым жа годзе памрэ гаспадар або гаспадыня. Калі ў мякішы здарыцца вертыкальная трэшчына, гэта прадказвае блізкі раздел сям'і, а калі гарызантальная – то або дачка пойдзе замуж, або сын пойдзе ў прымы [2, с. 82].

Пры выпечцы хлеба на першай зробленай з цеста булцы рукой рабілі крыж, а елі гэтую булку заўсёды апошняй. Непажадана было пачынаць новую булку хлеба вечарам, бо лічылася, што ў такім выпадку прападзе багацце. Згодна з народным звычаем, нельга было цэлы хлеб ламаць рукамі, а неабходна яго перахрысціць і рэзаць нажом, бо Бог пакарае і пакіне без хлеба. Верылі, што калі абнесці хлебам вакол будынка, які гарыць, то агонь не будзе далей распаўсюджвацца [1, с. 101]. Гэты звычай, між іншым, захаваўся да нашых дзён. У час пажару ў вёсках старыя людзі абносяць хлебам месца, якое гарыць, каб не даць агню распаўсюдзіцца.

З маленства ў беларусаў выхоўвалі павагу і любоў да хлеба як да самага галоўнага багацця. Беларускія этнографы XIX ст. прыводзяць цікавыя прыклады беражлівых адносін да яго. Так, нават у час бойкі хлапчукі адкладвалі ўбок хлеб і, толькі высветліўшы адносіны, бралі яго зноў і даядалі [1, с. 101].

Ва ўсе часы хлеб заўжды сімвалізаваў дабрабыт, хлебасольства, гасціннасць. На стале ў хаце павінен быў ляжаць каравай, пакрыты ручніком, з якім сустракалі і віталі гасцей. З даўніх часоў прыгатаванне хлеба было прывілеяй жаночай паловы сям'і. Жанчына, якая пякла хлеб, карысталася павагай родных, суседзяў, аднавяскоўцаў. У вёсцы заўсёды добра ведалі, у каго з гаспадынь атрымліваўся добры хлеб. Выпякалі хлеб звычайна раз на тыдзень, аднак гэта ў большай ступені залежала ад колькасці членаў сям'і. У вялікіх сем'ях пяклі і часцей, у малых – значна радзей, таму іх членам часта прыходзілася есці хлеб чэрствым.

Забаранялася класці хлеб верхняю скарынкаю ўніз, бо лічылася, што ў такім выпадку жыта будзе палеглым і каласы будуць на зямлі.

У час абеду хлеб рэзаў сам гаспадар, тым самым падкрэсліваючы важнасць і значнасць гэтага прадукту. Рэзалі яго лустамі, скібкамі, кавалачкамі. Было прынята, каб увесь парэзаны хлеб з'ядаўся. Калі ж бывала, што ён заставаўся, яго высушвалі на сухары і гатавалі смачны хлебны квас.

Ва ўсе часы існавала шмат прымавак і прыказак пра хлеб. Сёння

яны таксама з’яўляюцца папулярнымі. Вось некаторыя з іх.

Колас добра не спее, калі сонца добра не грэе.

Шмат снегу – шмат хлеба.

Хлеб над усім пануе.

Калі ёсць хлеб і вада, то не бяда.

Не той багаты, хто мае срэбра і злата, а той, хто хлеб мае.

Каб быць з хлебам, патрэбна добра працаваць. І на гэты конт выказваліся беларусы.

Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.

Хто працаваць рады, той будзе хлебам багаты.

Хто ў неба глядзіць, той без хлеба сядзіць.

На панскім полі хлеба не заробіш.

Хлеб – галоўнае багацце краіны і асноўны прадукт харчавання. Са старажытных часоў да гэтага прадукту чалавечай працы людзі ставіліся па-асабліваму. Клопат пра «хлеб надзённы» складаў асноўную частку чалавечага жыцця: дзяцей вучылі шанаваць і берагчы кавалак хлеба як самае вялікае на зямлі багацце. Яго параўноўвалі з золатам, сонцам, самім жыццём. Наш народ хлебасольны, бо хлебам і соллю сустракаюць і праводзяць дарагіх гасцей, з хлебам ідуць у сваты, на вяселле, хрэсьбіны. Аднак не кожны госць ведае, што каравай трэба разламаць, самому пакаштаваць і людзям раздаць, як тое звычай кажа. Не кожны ведае, што, прымаючы хлеб-соль на ручніку, хлеб варта пацалаваць.

З хлебам праводзілі на фронт. З хлебам сустракалі пераможцаў, якія вярнуліся з вайны. Хлебам паміналі тых, хто ўжо ніколі не вернецца.

У славян існаваў яшчэ адзін звычай: людзі, разламаўшы хлеб, становяцца сябрамі на ўсё жыццё. Хлеб – пасол міру і дружбы паміж народамі, застаецца ім і цяпер.

Гэтак жа, як да хлеба, спакон веку ставіўся народ і да працы тых, хто ствараў яго. З аднаго зярнятка атрымліваюцца усяго каля 20 мг мукі, для выпечкі аднаго батона трэба вырасціць, сабраць і размалоць 10000 зярнятак. Гэта абавязвае кожнага з нас беражліва адносіцца да хлеба, каб нават маленькі кавалачак яго не прапаў дарма.

Доўгі шлях праходзіць зерне, каб ператварыцца ў хлеб. Варта памятаць пра тое, што хлеб на нашым стале з’яўляецца дзякуючы нялёгкай працы людзей 120 прафесій. У кожным кавалку хлеба – праца мільёнаў людзей: трактарыстаў, аграномаў, камбайнераў і меліяратараў, металургаў і машынабудаўнікоў, селекцыянераў і генетыкаў, мікрабіёлагаў і біяхімікаў, захавальнікаў збожжа і

мукамолаў, пекараў і вадзіцеляў хлебных фургонаў, прадаўцоў і іншых прадстаўнікоў прафесій.

Кожны чалавек, які ведае сваю гісторыю, любіць свой народ, не зможа нядбайна ставіцца да хлеба. Мы ведаем, што ў хлебе закладзена не толькі праца нашых сучаснікаў-земляробаў, у ім пот і кроў нашых продкаў, таму непавага да хлеба і сёння прыраўноўваецца да самай страшнай абразы, якую можна нанесці чалавеку.

У нашай краіне вялікая ўвага надаецца развіццю сельскай гаспадаркі, таму што хлеб заўсёды быў і застаецца меркай стабільнасці і чалавечага дабрабыту.

Навечна будзь благаслаўёны,
Запрацаваны ў поце хлеб,
Не квашаны і не салёны,
Для важных спечаны патрэб!
(П. Броўка)

ЛІТАРАТУРА

1. Н а в а г р о д с к і, Т. А. Хлеб у народнай культуры беларусаў / Т. А. Навагродскі. – Беларуская думка. – 2008. – № 12. – С. 101–104.
2. С е р ж п у т о ў с к і, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск, 1998.
3. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БСЭ імя П. Броўкі, 1989. – 575 с.

УДК 821.161.3
**Мельнікава Ю. Ю. –** студэнтка

## ЯГО СЭРЦА НАЛЕЖАЛА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

*Навуковы кіраўнік – **Малько Г. І.** – канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Я хаджу, закаханы ў твае краявіды,
І шапчу як прызнанне: о мой край дарагі!
Зноў нясу табе споведзь, і трывогі, і крыўды,
І надзеі, і ўцехі, і любоў, і грахі…

Гэтыя цудоўныя радкі, прысвечаныя роднаму краю, належаць знакамітаму беларускаму паэту Нілу Гілевічу, які, на жаль, нядаўна пайшоў з жыцця. Аднак засталіся яго творы, якія ніколі не згубяць сваёй актуальнасці, бо яны пра самае дарагое, што ёсць у кожнага чалавека, – пра Радзіму і любоў да яе.

Амаль за 60 год жыцця ў літаратуры народнаму паэту Беларусі Нілу Сымонавічу Гілевічу ні разу не здрадзіла муза паэзіі. Яму пашчасціла быць нашчадкам моцнага сялянскага роду. Паэт нарадзіўся ў вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Там прайшлі яго дзіцячыя і юнацкія гады, тры з якіх выпалі на час нямецкай акупацыі.

Любоў да роднай мовы, жаданне авалодаць найбагацейшымі скарбамі літаратуры і сказаць у ёй сваё паэтычнае слова прывялі будучага паэта і пісьменніка спачатку ў Мінскае педагагічнае вучылішча, а затым на філалагічны факультэт БДУ. Пасля яго заканчэння з 1956 г. вучыўся ў аспірантуры, працяглы час працаваў на кафедры беларускай літаратуры. У 1963 г. Н. Гілевіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па гісторыі беларускай паэзіі XX ст., а ў 1978 г. атрымаў вучонае званне прафесара. Навуковая дзейнасць Гілевіча была высока ацэнена: яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі.

Творчасць Ніла Гілевіча добра вядомая не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за межамі нашай краіны. Прырода шчодра надзяліла яго шматгранным талентам: паэт-лірык і публіцыст, сатырык і драматург, палымяны прамоўца, трыбун, грамадскі дзеяч, асветнік, вучоны, фальклarыст, перакладчык. Ён быў першым сакратаром Саюза пісьменнікаў БССР, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, старшынёй Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, заснавальнікам і першым старшынёй Таварыства беларускай мовы, якое ўзначальваў з 1989 да 1997 г.

Выступаць з вершамі ў друку Ніл Гілевіч пачаў у 1946 г. У 1954 г., яшчэ студэнтам трэцяга курса, быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў, а ў 1957 г. выйшаў яго першы зборнік “Песня ў дарогу”. З таго часу і да канца жыцця ў розных літаратурных жанрах паэтам напісана каля васьмідзесяці кніг. На першым месцы ў гэтым творчым набытку паэзія: і лірычная, і эпічная, і сатырычна-гумарыстычная.

Тэма захавання нацыянальнага, самабытнага на роднай зямлі – вядучая ў паэзіі Ніла Гілевіча. Занядбанне роднай культуры, традыцый, заняпад гістарычнай памяці, абарона матчынай мовы, сацыяльнае і духоўнае ўваскрэсенне народа, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, чарнобыльская бяда – вось далёка не поўны пералік асноўных матываў яго кніг.

Паэтычнай дамінантай Ніла Гілевіча з’яўляюцца матывы маці і роднай матчынай мовы, якія прыпадабняюцца да малой Радзімы, да

Маці-Беларусі, беларускай народнай песні, што сімвалізавала душу нацыі, яе самабытную культуру.

Узрушана і хвалююча піша паэт пра перажытае Радзімай у Вялікай Айчыннай вайне. Беларусы панеслі незлічоныя страты, але выстаялі, перамаглі, бо абаранялі святое – родную зямлю, часцінку іх душы, роднае гняздо, дзе яны нарадзіліся, выраслі, адкуль у жыццёвы вырай паляцелі іх дзеці, дзе знайшлі вечны спачын продкі. У самыя трагічныя часы гісторыі самаахвярная любоў да Бацькаўшчыны надавала сілы, мужнасці, цярпення вынесці ўсе пакуты.

У рамане “Родныя дзеці”, першым рамане ў вершах у беларускай літаратуры, паэт вядзе засяроджаны роздум пра гісторыю, культуру і экалогію роднай зямлі. Гэты твор – святая і балючая памяць роднай зямлі. Ніл Гілевіч імкнецца выявіць сутнасць беларускай душы, сам дух беларускасці, лад і стыль беларускага жыцця, паказвае побыт беларусаў, паэтызуе беларускую прыроду, раскрывае высокі і трагічны сэнс сапраўднага кахання. Раман паглыбляе, удакладняе, дапаўняе змест раней сказанага паэтам аб вечных каштоўнасцях у жыцці: Радзіме, народзе, чалавеку. У рамане пастаўлены і прааналізаваны тыя праблемы, ад вырашэння якіх залежыць не проста многае, а ўсё ў нашым грамадстве, існаванне нас як нацыі і народа наогул: захаванне гістарычнай памяці, прыроды, духоўнай спадчыны – усяго таго, што і з’яўляецца “златам дзяржавы”, як вызначыў духоўнасць яшчэ М. Гусоўскі. Галоўная ідэя паэмы і адначасова пісьменніцкі наказ усім нам быць сваёй сям’і, Радзіме і зямлі-карміцельцы роднымі дзецьмі, а не пасынкамі сфармуляваны ў афарыстычных радках:

Мы – тройчы дзеці ў вечным крузе:
Мы – дзеці роднае сям’і,
І – дзеці Маці-Беларусі,
І – дзеці Матухны-Зямлі.
Трайны ён, круг, ды недзялімы…

У творы паўстае вобраз Маці-Беларусі, Маці-Зямлі, жыццё якой павінны зберагчы ўсе людзі – яе дочкі і сыны. У гэтым – галоўнае прызначэнне чалавека на Зямлі, бо абыякавасць да маці, да Радзімы, да сваёй Зямлі вядзе да вялікіх стратаў, сусветнай катастрофы, якую нельга ўжо будзе выправіць.

Творы Ніла Гілевіча нясуць у сабе высокі зарад праўды, сумленнасці, мужнасці, болю, выяўляюць шчыры і глыбокі клопат мастака пра лёс Бацькаўшчыны, беларускага народа, яго занядбанай гісторыі, культуры, мовы. Яны выкрасаюць у сэрцы святы агонь

духоўнасці, умацоўваюць веру ў будучыню Беларусі, шчаслівы лёс дзяцей на роднай зямлі.

Праблемы нацыянальнага адраджэння Ніл Гілевіч звязвае з роднай мовай, і шматлікія пытанні яе развіцця ніколі не здымаліся з парадку дня паэта. Чароўную сілу і веліч роднага слова ён імкнецца ўвасобіць у мастацкіх вобразах. Асэнсаванне нацыянальнай ідэі знаходзім у вершах "Роднае слова", "Родная мова", "Мара Скарыны", "Мова майго народа", "Слова". Паэт падкрэслівае, што "мілагучнае, звонкае, спеўнае слова" дадзена кожнаму ад маці як найдаражэйшы скарб. На мове бацькоў спасцігаюцца духоўныя багацці нацыянальнай і сусветнай культуры, таямніцы кніжнай мудрасці.

Як ты дарага мне, мая родная мова!
Мілагучнае, звонкае, спеўнае слова!
Ты калісьці з калыскі мяне падымала
І вучыла ў бацькоў на руках гаварыць.
У жыцці маім слова найпершае "мама"
І цяпер для мяне сама міла гучыць.
Я па літарах родных вучыўся чытаць,
І буквар для мяне быў жыцця палавінай.
Быў шчаслівы я роднаю мовай сказаць
Першы раз: "Беларусь, мая сонца-краіна!"

Любоў Ламека, літаратурны крытык, так напісала пра Ніла Гілевіча: "Пачатак, аснова, сутнасць яго творчасці-лёсу – Боль. Глыбокі, усепаглынаючы боль за Бацькаўшчыну, родную зямлю, мілую сэрцу Беларусь на пакутным крыжы лёсу. Я ніколі не перабольшу, калі Ніла Гілевіча назаву Сумленнем Бацькаўшчыны. Ён не мог не нарадзіцца на нашай зямлі, якая адвеку прагла Волі, Незалежнасці. Ён патрэбен ёй як заступнік, абаронца і захавальнік яе духоўных скарбаў, носьбіт яе гістарычнай памяці, як каталізатар адраджэння беларускага Духу. Яе годны прадстаўнік у супольнасці народаў свету".

ЛІТАРАТУРА

1. Г а р э л і к, Л. Несмяротнае матчына слова: Творчасць Ніла Гілевіча ў школьнай праграме / Л. Гарэлік // Роднае слова. – 1993. – № 3. – С. 18–26.

УДК 392.8(476)
**Палячэнка Г. В.** – студентка

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПОЯСА Ў АБРАДАХ БЕЛАРУСАЎ

*Навуковы кіраўнік –* ***Куніцкая А. М.*** *– ст. выкладчык*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Пояс у традыцыйнай культуры беларусаў з даўніх часоў з’яўляўся значным і шматфункцыянальным прадметам. Ён быў неабходным кампанентам адзення, выконваў разнастайныя сімвалічныя і абрадавыя функцыі, а таксама выкарыстоўваўся ў побыце ў розных мэтах.

Пояс у народных вераваннях – знак дарогі, шляху праз міфічныя і рэальныя перашкоды (гэтак жа, як нітка, вяроўка, ланцуг). Як частка адзення чалавека, якая прымае форму круга, ён часта ўжываецца ў якасці засцярогі, перагароджвае шлях нячыстай сіле, абараняе ад благога вока і хвароб. Адсюль абавязковае патрабаванне падпяразвацца і шырокае ўжыванне гэтага прадмета адзення ў абраднасці. Акрамя таго, раней нашэнне пояса з’яўлялася этычнай нормай, асабліва для мужчын. Выходзіць з хаты не падперазаўшыся лічылася непрыстойным: «з’яўленне без шапкі і басанож не здзівіць іншых так, як з’яўленне без апаяскі» [3]. Расперазаць чалавека азначала зганьбіць яго. Аб вялікім значэнні, якое надавалася поясу, сведчаць трапныя народныя выразы, звязаныя з гэтым словам. Напрыклад, «расперазацца» азначае згубіць прыстойнасць паводзін. Па павер’ях, хадзіць без пояса было гэтак жа “грэшна”, як і без крыжа. У фальклоры «без крыжа, без пояса» з’яўляюцца адмоўныя героі.

З найстаражытнейшых часоў пояс разглядаўся як нейкая засцярога, магічны аб’ект, які спрыяў дабрабыту і поспеху. Народ свята верыў у яго магутную сілу, аб чым сведчаць рукапісныя кнігі простанароднай медыцыны: «А ад усякай псуты і злых ведзьмакоў насіць на голым целе пояс вязаны, таму што пры гэтым талісмане не можа дзейнічаць ніякае вядзьмарства» [1]. У некаторых усходніх рэгіёнах Беларусі існаваў абрад уваходу ў новую хату: гаспадар уваходзіў першым, а за пояс уцягваў у хату ўсіх іншых членаў сям’і.

Пояс ужываўся ў замовах ад хваробы. Хворы на ліхаманку ішоў у лес, знаходзіў асіну, кланяўся ёй і казаў: «Асіна, асіна, вазьмі маю трасіну, дай мне здароўе» [1]. Пасля чаго перавязваў асіну сваім поясам.

І хоць з часам пояс набыў больш утылітарнае значэнне, ён працягваў выконваць вялікую ролю ў народных варожбах, абрадах, у шматлікіх замовах і як засцярог. Людзі верылі, што можна нашкодзіць чалавеку, выканаўшы над ім поясам розныя вядзьмарскія дзеянні. Так, дзяўчаты варажылі аб сваім суджаным: да пояса на ноч прывязвалі замок, замыкалі яго і ключ клалі пад галаву са словамі: "Нарачоны, жаніх, адамкні мяне". Можна было пакласці пояс пад падушку, кажучы: "Пояс, мой пояс, пакажы жаніха" [1]. Пад Новы год гаспадыні звязвалі парамі бытавыя і гаспадарчыя прадметы па прымеце: у надыходзячым годзе ўсё ў хаце будзе падвойвацца, дадавацца. Дзяўчаты, якія жадалі выйсці замуж, шукалі ў лесе дзве такія асіны, якія можна было перавязаць адным поясам. Калі знаходзілі, то лічылі, што жаданне іх аб замужжы спраўдзіцца.

Вера ў магічнае значэнне пояса мела абавязковае месца і пры дарэнні паясоў падчас сватаўства і вяселля. Калі нявеста перадала жаніху такі падарунак, то ўжо не мела права змяніць рашэнне і адмовіць яму. Як правіла, нявеста дарыла жаніху вытканы ёю вузкі ваўняны пояс у чырвоных танах.

Пояс служыў і бацькоўскім благаславеннем, ён перадаваўся ў спадчыну з пакалення ў пакаленне.

Беларусы павязвалі поясам дзіця адразу пасля Вадохрышча. Чалавек, які нарадзіўся, атрымліваў талісман, з якім праходзіла ўсё яго жыццё. Пояс, надзеты пры Вадохрышчы на голае цела, насіўся да скону і нават у лазні не здымаўся.

На ўкраінскіх землях пры провадах памерлага з хаты сваякі нярэдка завязвалі поясам вароты, «каб больш нябожчыкаў не было», – лічылася, што падперазанага чалавека «нячысцік баіцца», яго не кране ні дамавік, ні лясун [1].

Разам з тым здыманне пояса азначала прылучэнне да таго свету, нячыстай сілы і г. д. Таму пояс здымалі пры пошуку "кветкі папараці" ў ноч на Івана Купалу, пры пошуках скарбу, падчас выканання абрадаў супраць эпідэмій і мору жывёлы. Адмыслова вытканы за адзін дзень з астаткаў лёну пояс, па павер'і сялян з Мінскай губерні, дазваляе таму, хто падперазаўся, убачыць на Раданіцу мёртвых. Маладая, уваходзячы ў хату мужа пасля шлюбу, кідае свой пояс на печ.

У радзільных рытуалах выкарыстанне пояса было накіравана на палягчэнне працэсу родаў. Парадзіха распяразвалася 8 разоў, а ў выпадку цяжкіх родаў на падлозе рассцілаўся чырвоны пояс, праз які яна павінна была пераступіць і дзявяты раз [3]. Гэта сімвалічнае пераадоленне

мяжы паміж светамі павінна было дапамагчы немаўляці з'явіцца на свет. Дзіця ўпершыню падпаясвалі пасля хрышчэння, што азначала яго аддзяленне ад іншага свету і ўваходжанне ў свет людзей. Першы пасок у падарунак дзіцяці прыносіла бабка-павітуха, якая прымала роды.

Вясной, калі скаціну першы раз выганялі ў поле, было прынята рассцілаць у варотах пояс, часцей чырвоны; яго таксама прывязвалі да рагоў каровы, клалі пастухам і г. д. Купіўшы жывёлу, патрэбна было ўвесці яе ў новы хлеў праз пояс, у гэты момант кажучы: «Забывай старога гаспадара, прывыкай да новага». Напярэдадні першага выгану скаціны гаспадыня пляла з трох ільняных нітак пояс, нашэптваючы: «Як гэты плецяшок пляцецца, так мілая скацінка пляціся на свой двор з следа ў след, з шага ў шаг. Нідзе не заблуждайся, ні ў цёмных лясах, ні ў зялёных лугах, ні ў чыстых ралях». Гэты пояс яна насіла да самага выгану, а калі здымала яго з сябе, то закопвала ля выхаду з двара са словамі: «Калі моцна і шчыльна пояс вакол мяне трымаўся, так моцна кароўка круг двара трымайся». Рассцілаючы пояс перад хлявом або варотамі двара, сачылі, каб карова яго «не пацягнула нагамі», паколькі гэта абяцала няшчасце па дарозе на пашу [1].

Магічныя ўласцівасці пояса выкарыстоўваюцца і ў вясельным абрадзе: ім абвязваюць нявесту або жаніха і нявесту, вузел з пасагам нявесты, пірог для жаніха пасля першай шлюбнай ночы, чарку або бутэльку для жаніха, сцелюць пад белы прыгожы ручнік пры вянчанні і г. д.

Бяздзетныя жанчыны ў імкненні мець наследнікаў кладуць пад падушку пояс святара або носяць пры сабе кавалачак яго, падпярэзваюцца на Юр’еў дзень і г. д. З мэтай прымкнуць маладую да нараджэння дзяцей да яе на калені саджалі хлопчыка, яна цалавала яго і дарыла «дзявоцкі пояс».

Калі хавалі памерлага, пояс звычайна расшпільвалі, каб не замінаць душы канчаткова пакінуць цела і адправіцца ў замагільнае вандраванне. Калі не зрабіць гэтага, мёртвы, лічылася, не здабываў супакою і мог, чаго добрага, панадзіцца ўставаць па начах!

Паясы знаходзілі прымяненне і ў народных гульнях. Напрыклад, у Горацкім раёне існавала гульня пад назвай «выбівалы»: хлопец браў пояс, падыходзіў да дзяўчыны, якая яму падабалася, і біў яе поясам, пасля чаго яны разам ішлі гуляць. У Бярэзінскім раёне падчас гульні хлопец даваў канец пояса дзяўчыне, а яна абмотвала яго вакол сябе. У Гомельскім раёне ў канцы XIX ст. на Юр’еў дзень існаваў звычай

«юрыцца», калі дзяўчаты ішлі ў лес ці ў поле, пад бярозай рыхтавалі яечню, выбіралі сабе сяброўку на цэлы год і мяняліся з ёй паясамі і хусткамі, пасля чаго казалі: «Мы з ёй паюрыліся» [3].

Такім чынам, у традыцыйным касцюме беларусаў пояс выконваў адразу некалькі функцый: практычную, сімвалічную, магічную, ахоўную, этычную, знакавую, эстэтычную. У цяперашні час узорыстыя паясы, выкананыя ў традыцыйных тэхніках пляцення і ткацтва, шырока выкарыстоўваюцца ў сцэнічным і цырыманіяльным касцюме. Іх вырабам працягваюць займацца народныя майстры, прадпрыемствы мастацкіх промыслаў, аматары традыцыйнай культуры. Пояс з’яўляецца адным з самых папулярных сучасных беларускіх сувеніраў.

ЛІТАРАТУРА

1. Крук, Янка (Крук, Іван Іванавіч). Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2000. – 350 с.

2. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БСЭ імя П. Броўкі, 1989. – 575 с.

3. school8.mogilev.by/payasy. – Дата доступу: 16.04.2016.

УДК 808.26(072)

**Пучко Ю. В. –** студэнтка

## “ТРАСЯНКА” ЯК ЗМЕШАНАЕ РУСКА-БЕЛАРУСКАЕ МАЎЛЕННЕ

*Навуковы кіраўнік – **Малько Г. І.** – канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Сучасная моўная сітуацыя на Беларусі характарызуецца пераважна суіснаваннем і выкарыстаннем беларускай і рускай моў і можа быць вызначана як беларуска-рускае двухмоўе. Нацыянальнае беларуска-рускае двухмоўе прадстаўлена індывідуальным беларуска-рускім (калі побач з роднай беларускай двухмоўны індывід выкарыстоўвае і рускую мову), руска-беларускім двухмоўем і індывідуальным беларускім і рускім аднамоўем.

Сапраўды, значная частка насельніцтва Беларусі актыўна карыстаецца і рускай, і беларускай мовамі ў розных сферах грамадскай дзейнасці. Аднак існуюць і значныя кантынгенты людзей, якія практычна карыстаюцца толькі якой-небудзь адной мовай.

Калі ж браць пад увагу і пасіўнае валоданне другой мовай, і ўспрыманне на ёй пэўнай інфармацыі, то трэба прызнаць, што ўсё

беларускае насельніцтва з’яўляецца двухмоўным, бо на падставе шматлікіх назіранняў у розных краінах свету за апошнія гады было засведчана, што такога ідэальнага білінгвізму, каб чалавек аднолькава дасканала валодаў некалькімі мовамі, або наогул не існуе, або сустракаецца досыць рэдка, а таму гэтую з’яву трэба лічыць хутчэй выключэннем, чым правілам.

У сітуацыі двухмоўя ўзаемадзеянне моў, якія кантактуюць, прыводзіць да інтэрферэнцыі, гэта значыць пры маўленні на адной мове ўжываюцца элементы іншай мовы. Іншымі словамі, інтэрферэнцыя прыводзіць да парушэння нормаў суіснуючых моў. Блізкароднасны характар беларускай і рускай моў абумоўлівае шматлікасць і ўстойлівасць інтэрферэнцыйных памылак пры маўленні на той ці іншай мове. Беларуска-руская і руска-беларуская інтэрферэнцыя – з’ява распаўсюджаная і закранае ўсе сферы моўнай сістэмы: фанетыку, акцэнтуацыю, марфалогію, лексіку, сінтаксіс. Вылучаюць наступныя віды інтэрферэнцыі: ***марфалагічная, сінтаксічная, фанетычная, лексічная, словаўтваральная, акцэнтная***.

Як вынік інтэрферэнцыі на тэрыторыі Беларусі функцыянуе такая лінгвістычная з’ява, як трасянка, прамежкавая форма змешанага маўлення, своеасаблівы моўны гібрыд.

Сам тэрмін узнік не так даўно. В. Ластоўскі ў 30-я гг. называў гэтую з’яву “чаўня”. Апошнім часам разам з тэрмінам “трасянка” выкарыстоўваюцца больш агульныя назвы: “змешанае маўленне”, “змешанае беларуска-рускае прастамоўе”, “змешаная мова”, “мешаніна”, “ламаніна” і інш. Многія аўтары шляхам стварэння назваў змешанага беларуска-рускага маўлення выказваюць свае негатыўныя эмацыянальныя адносіны да гэтай з’явы і называюць яе ***“брыдкая трасянка”, “горшая трасянка”, “жудасная трасянка”, “знакамітая, жахлівая сваёй убогасцю трасянка”***.

Літаральна словам “трасянка” (часам у расійскай перыёдыцы яно пішацца праз “о”: “тросянка”) называецца сумесь сена і саломы, што выкарыстоўваецца ў якасці корму для жывёлы. Сэнс “недабраякасная сумесь” і быў перанесены ў моўную сферу.

З лінгвістычнага пункту погляду трасянка – эта моўны прадукт, які ўзнік шляхам механічнага змешвання элементаў рускай і беларускай моў, “мноства стыхійна і па-рознаму русіфікаваных індывідуальных варыянтаў беларускага маўлення”, або, іншымі словамі, “мова, заснаваная на беларускай, але з вялікай колькасцю рознаўзроўневых

элементаў рускай мовы”. Гэта сродак камунікацыі гарадскога насельніцтва Беларусі, русіфікаваны варыянт беларускай мовы.

Часам пад ёй разумеюць “рускую мову, перанасычаную элементамі розных узроўняў беларускай”. Вызначыць аснову трасянкі – рускую або беларускую – вельмі складана з-за блізкасці моў і вялікай колькасці адхіленняў ад нормы. Лічыцца, што змешанае маўленне адносіцца да той мовы, да якой адносіцца граматычны лад маўлення. У практыцы ж бываюць выпадкі, калі, напрыклад, прыназоўнік беларускі, а канчатак рускі (*аб чалавеке*) або, наадварот, злучнікі беларускія, што абцяжарвае выкарыстанне гэтага прынцыпу.

Цвёрдай мяжы паміж трасянкай і рускай і беларускай мовамі, натуральна, не існуе. Але ў якасці крытэрыю можна прыняць тое, што рускай мовай з беларускім акцэнтам мы завём маўленне з пераважна рускай лексікай, беларускай фанетыкай і ў асноўным рускай марфалогіяй. Маўленне са змешанай лексікай (з вялікім працэнтам рускай лексікі) і марфалогіяй і беларускай фанетыкай лічыцца трасянкай.

Ад літаратурнай мовы трасянку адрознівае поўная адсутнасць норм: беларуска-рускае маўленне не падпарадкоўваецца строгім правілам і ўяўляе сабой механічнае змяшэнне розных моўных элементаў. Акрамя таго, трасянка характарызуецца малой прадказальнасцю. Вось адзін з прыкладаў трасянкі: *Шчас пагляджу, якие сапожкі прадаюць* (Менск). Тут у наяўнасці беларуская фанетыка (*шч, дж, ць*); лексіка прадстаўлена і беларускай (*якие*) і рускай (*шчас* (= зараз), сапожкі), лексема *прадаюць* (прадаюць) і *пагляджу* (пагляджу) ёсць як у рускай, так і ў беларускай мовах.

Вельмі часта можна пачуць наступныя словы і выразы з трасянкі: *да, вот, іменна, как, эта, то есць, дзярэўня, курей, шчот, абшчэнне, выдзвігаць, палучаць, нада, апрэль, атражаць, скамейка, наскі, гасударства, мець інцярэсы, з бацькай, беларускі язык, аб’яўленне.* Прыклады можна прыводзіць бясконца.

Вельмі ўдала парадзіруе трасянку Ніл Гілевіч у сваім рамане ў вершах “Родныя дзеці”:

Дык вот у нашай юбіляркі
Есь многа качестваў такіх,
Што быў бы грэх не выпіць чаркі,
Не ўшанаваць пачотам іх.

А першым качаствам законна
Шчытаю я без лішніх слоў,
Што хоць і ў возрасце прыклонным,
Ана не знаець дактароў.

Феномен трасянкі як змешанай формы дзвюх моў не ўнікальны ў сусветнай практыцы. Аналагічныя з’явы характэрныя для краін, дзе

літаратурная мова істотна адрозніваецца ад мясцовых “дыялектаў”, часта фактычна моў, і дзе адбываецца сціранне найболей рэзкіх адрозненняў і ўтварэнне прамежкавых форм. Сярод прыкладаў можна назваць Германію (штодзённа-гутарковая мова), арабскія краіны, Японію (новыя дыялекты, у якіх існуюць як элементы ранейшых дыялектаў, так і літаратурныя, а таксама элементы, якія не існуюць нідзе, акрамя новых дыялектаў.

У першай палове XX ст. трасянка была характэрна ў асноўным для часткі гараджан, якія нядаўна перасяліліся з вёскі, у той час як у вёсцы і ў невялікіх мястэчках размаўлялі пераважна на мясцовай беларускай мове. Аднак паступова ў буйных гарадах яе амаль выцесніла руская мова, затое трасянка пракралася ў вёску і стала там актыўна распаўсюджвацца.

Цяпер найболей моцныя пазіцыі трасянка займае ў невялікіх мястэчках і ў вёсцы; менш трасянкай карыстаюцца ў буйных гарадах, асабліва ў Мінску, аднак небывалая міграцыя вяскоўцаў у горад таксама пашырае сферу выкарыстання трасянкі. Ва ўспрыманні саміх носьбітаў трасянка ацэньваецца як «некультурная мова», бо напамінае пра іх вясковае паходжанне.

Шырокае выкарыстанне трасянкі можа істотным чынам паўплываць як на культуру рускамоўнага, так і беларускамоўнага маўлення. З гісторыі вядома, да якіх вынікаў прыводзіць масавае засваенне ненарматыўнай чужой мовы. Пэўную пагрозу ўяўляе трасянка і для лёсу беларускай літаратурнай мовы.

ЛІТАРАТУРА

1. Л у к а ш а н е ц, А. А. Двухмоўе / А. А. Лукашанец // Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск,1994. – С. 174–176.

2. Ц ы х у н, Г. А. “Трасянка” як аб’ект лінгвістычнага даследавання / Г. А. Цыхун // Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22–24 кастрычніка 1997 г.). – Мінск, 1998. – С. 83–89.

УДК 476:392
**Редько О. Н.** – студентка

# ОБЕРЕГИ В ТРАДИЦИОННОЙ КУЛЬТУРЕ БЕЛОРУСОВ

*Научный руководитель – **Ю. В. Кирчук** – ст. преподаватель*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

В соответствии с традиционными представлениями наших далеких предков, человек представлял собой сложнейший организм, который являлся органической составной частью окружающей природы. Колоссально богатый опыт познания человеком природы, собственного внутреннего мира весьма выразительно и многогранно сфокусирован в обрядовой практике этноса. Сложнейшая система регламентаций, предписаний, запретов и ограничений была направлена на постоянную гармонизацию отношений человека, семьи с конкретным местом проживания, с миром предков, с миром Вселенной. Человек знал: каждый поступок – это очередной шаг на пути оптимизации отношений и соответственно Космос ответит тебе взаимностью либо ты, нарушая традицию, подвергаешь себя проклятию богов и предков. Результаты наказания могли быть самыми непредсказуемыми.

Огромное внимание уделяли наши предки проблеме защиты человека от негативного энергетического воздействия других людей: от сглаза, дурного слова, человеческой зависти, специально сказанного проклятия. Чтобы обезопасить себя (прежде всего детей) от разнообразных форм и средств агрессии, человек придумал огромное количество оберегов, амулетов и талисманов.

В обрядовой практике белорусов очень широкое распространение получили всевозможные обереги, среди которых специальные ритуальные действия, например, очерчивание круга, обходы дворов, вызывание дождя и т. д.; ритуальные атрибуты: крещенская вода, громничная свеча и т. д.

Функционально близкими к оберегам являются амулеты – предметы, которые постоянно следовало носить при себе. Они были призваны оберегать от нечистой силы, сглаза, болезней, порчи; их носили на цепочке, веревочке на шее, пришивали к одежде, закладывали за отворот шапки. Амулеты предназначались людям, детям, домашней скотине, птицам. Нередко амулеты передавались по наследству [2].

Самым распространённым оберегом была четверговая соль. Из ткани красного цвета шили небольшой мешочек, туда сыпали несколь-

ко крупинок освященной на «семи ветрах» соли. Такой амулет носили при себе на протяжении всего года – от Пасхи до Пасхи: после освящения соли в чистый четверг следовало засыпать «обновленную» соль.

Надежным амулетом на протяжении всей жизни считали кусочек пуповины или детской «сорочки» – части околоплодной ткани, с которой рождался ребенок.

Ряд растений, скорее всего за «жгучесть» или резкий запах эфирных масел также считали мощным средством от нечистой силы, например чеснок, горький перец, крапиву.

Наши предки делали амулеты из волчьего или медвежьего клыка, шерсти или шкуры этих животных.

В обрядовой практике славян одним из самых надежных оберегов считали острые предметы. Так, булавка, купленная во второй половине пятничного дня, заняла свое постоянное место под лацканом пиджака или на изнаночной стороне одежды.

В белорусской народной культуре красный цвет всегда символизировал постоянство, рождение, жизнь. Поэтому одежда славян всегда маркировалась орнаментом красного цвета по линии ворота, на плечах, груди и обязательно животе. Ленты, пояса, нити красного цвета, которые надевали под одежду, повязывали на руку, шею, пояс, во все времена считались надежными оберегами человека. Серьги и кольца с красным камнем также способны выполнять защитную функцию.

С приходом христианства к амулетам стали относить ладанки – небольшие емкости или мешочки, в которых хранили ладан, воск, небольшую часть мощей святых и т. п. Одним из самых сильных оберегов стал крест.

Для животных надежным оберегом считали колокольчик, «жидкое серебро» – ртуть, которую заливали в рог корове.

Для домашней птицы амулетом служил «куриный бог» – плоский камень с дырочкой природного происхождения [1].

Каждый человек без исключения может стать объектом зависти и сглаза, даже не догадываясь об этом. Чтобы личные успехи в работе и личной жизни не сменились черной полосой по чьей-то злой прихоти, нужно защитить себя и своих близких с помощью специальных оберегов от порчи и сглаза. Чтобы оградить себя от различных несчастий, негативных воздействий и попадания под низкие вибрации, славяне придумали обережные символы. За ними стоит сила, мощь рода, тесная связь с природой, которая являлась святыней пращуров.

ЛИТЕРАТУРА

1. К о т о в и ч, О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – 8-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013. – 592 с.

УДК 94/476
**Святощик М. И.** – студентка
## ДНЕПРОВСКО-БУГСКИЙ КАНАЛ КАК ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ ОБЪЕКТ
*Научный руководитель* – ***Козлова З. Н.*** – *канд. ист. наук, доцент*
УО «Барановичский государственный университет»,
Барановичи, Республика Беларусь

Известным памятником гидротехнического строительства в Беларуси является Днепровско-Бугский канал. В 2015 г. отмечалось 240-летие с начала его строительства в 1775 г. Наши предки могли попасть с Днепра на Буг по рекам Припять, Пина, Волока, Муховец. На этом удобном водном пути было только одно препятствие – полоса заболоченной поймы, которую приходилось преодолевать волоком.

Первый проект канала был подготовлен белорусским картографом Ф. Ф. Чаки ещё в 1766 г. при короле Станиславе Августе Понятовском, поэтому канал стал называться Королевским. Этим названием пользовался и зачинатель белорусской географии А. Смолич [1, с. 12]. Первый этап строительства канала был завершён в 1783 г., и в ходе его были выпрямлены извилистые русла Пины и Муховца. Канал начал использоваться для сплава леса и прохождения небольших судов. После работ 1837–1848 гг. появилась возможность проводить баржи с возможной осадкой. Необходимый уровень воды поддерживался семью деревянными водозаборными плотинами. В 1940 г. канал вновь подвергся реконструкции: была выпрямлена часть его трассы к востоку от Кобрина. Одновременно была проведена его реконструкция, позволившая сократить общую длину и уменьшить количество шлюзов с 22 до 10. Позднее деревянные ворота гидроузлов были заменены металлическими, установлена световая сигнализация. В настоящее время по каналу перевозят минеральное сырьё и лесоматериалы.

На берегах канала проходили многие знаковые для отечественной истории события. Во-первых, полесский регион – место расселения дреговичей, поэтому несомненный интерес вызывают сохранившиеся на берегах канала и входящие в его систему рек археологические памятники, в частности курганы в окрестностях деревень Киселевцы Ко-

бринского и Рагодощ Ивановского районов. Шесть курганов возле деревни Киселевцы называют «французскими могилами» Во-вторых, этого региона касались события войны 1812 г. В-третьих, Вороцевичи Ивановского района – родина Наполеона Орды, а в деревне Закозель Дрогичинского района – родовое имение Ожешко. Названные населённые пункты несколько удалены от канала. А непосредственно на берегу канала, в деревне Дубое Пинского района, на юго-западной ее окраине, частично сохранился приусадебный парк, заложенный еще в середине 18 в. В 19 в. он приобрёл пейзажную композицию. В усадьбе прошли детские годы польского поэта А. Нарушевича. И, хотя большинство усадебно-парковых построек до нас не дошли, сохранившиеся фрагменты парка свидетельствуют о великолепии возведенного здесь ансамбля, включавшего в себя также систему каналов, дамб, прудов и фонтанов. Прошло более 200 лет со времени строительства парка, но берега водоёмов сохранили прямолинейность, четкость конфигурации. Из возведенных здесь строений сохранились бывшее здание костёла (сейчас церковь Рождества Богородицы), флигель (жилой дом профессоров сельскохозяйственной школы), домик бывшей молочной, мастерской по выделке овчин, дом сторожа. Парк заслуживает внимания как оригинальный памятник садово-паркового искусства, хотя восстановление его затруднено в связи с застройками частного сектора.

Самые драматические события развернулись на берегах канала в годы Великой Отечественной войны. На территории Кобринского. Ивановского, Дрогичинского и Пинского районов активно действовали партизанские отряды и соединения, фашисты проводили каратерные акции. В ходе таких акций в 1942–1943 гг. были сожжены деревни Череванцы и Орел Кобринского района, Галик и Ямник Дрогичинского района вместе с жителями. Их память увековечена памятниками и обелисками.

В 1943 г. партизанской бригадой имени Молотова была проведена операция по срыву перевозок фашистов по Днепровско-Бугскому каналу. Операция была разработана Белорусским штабом партизанского движения. В результате успешного проведения намеченных диверсий были остановлены перевозки по водной артерии 129 судов противника. В 1943 г. канал превратился в своеобразную линию фронта. Северную его сторону контролировали немцы, южную – формирования Брестского и Пинского партизанских соединений. На берегах Днепровско-Бугского канала в феврале-марте 1944 г. развернулся 40-

дневный ожесточенный поединок шести тысяч партизан с большой, численно и технически превосходящей группировкой противника. Партизаны не давали ей форсировать водный рубеж, что было реальной помощью армии, которая вела здесь наступление. К 31.03.1944 г. основные силы партизан соединились с частями Красной Армии. В деревне Заречка Дрогичинского района этот подвиг партизан в 1966 г. увековечен скульптурой партизана с винтовкой в руке.

Таким образом, Днепровско-Бугский канал представляет собой интерес, потенциал населённых пунктов в этой зоне может быть широко использован в организации экскурсионной работы.

ЛИТЕРАТУРА

1. С м о л і ч, А. Геаграфія Беларусі / А. Смоліч; Пасляслоўе А. Ліса. – 4-е выд. – Мінск: Беларусь, 1993. – 382 с.

2. Ф е д о р у к, А. Т. Садово-парковое искусство Белоруссии / А. Т. Федорук. – Минск: Ураджай, 1989. – 247 с.

УДК 940.5(092)

**Сипайло Б. С.** – студент

## ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ АСПЕКТ В БИОГРАФИИ СЕМЬИ

*Научный руководитель –* ***Лукина Л. В.*** *– канд. ист. наук, доцент*
УО «Витебская государственная академия ветеринарной медицины», Витебск, Республика Беларусь

В биографиях конкретных лиц, их родословных, фамилий предстает история народа, страны, города. Каждая биография, как люди, уникальна, неповторима и является свидетелем, участником реальных исторических событий, детально отражая течение времени, характеристики эпохи, социально значимые процессы.

Витебский архитектор Тихон Васильевич Кибардин (1863–1933 гг.), сформировавший архитектурный облик центра Витебска, окончил архитектурное отделение Императорской Академии художеств в Петербурге и, желая начать самостоятельно семейную жизнь, уехал в 1890 г. в губернский Витебск на должность младшего архитектора строительного отделения Витебского губернского управления. Кибардин Т. В. – автор проектов многих общественных и наиболее значимых жилых зданий Витебска, построенных в течение 30 лет. Его работоспособность, знания, талант, художественный вкус и такт практически создали образ города, продемонстрировав с годами естественность и закономерность.

На рубеже XIX–XX вв. для своей семьи: жена – графиня Елизавета Борисовна Толстая и 9 (девять) детей – Т. В. Кибардин на собственные средства построил одноэтажный особняк. Здание на Соборной улице (ныне улица Крылова, 6) с выразительными чертами модерна, представляющее историческую и художественную ценность, вошло в уже сформированный к тому времени ансамбль уличной застройки города. Усилиями Т. В. Кибардина была перестроена городская ратуша (1911 г.), построены здания государственного банка и театра (не сохранились), ряд жилых построек, больница духовной семинарии (1908–1910 гг.), казармы 41-й артиллерийской бригады, дрожжевой и пивоваренный заводы. Совместно с И. Фоминым в 1911–1912 гг. был разработан, выполнен и установлен сохранившийся до наших дней памятник воинам Отечественной войны 1812 г.

Младшей в многочисленной семье Кибардиных, родившейся в городе Марка Шагала, Ю. М. Пэна, Казимира Малевича, была Валентина Тихоновна (1907–1988 гг.), ставшая актрисой театра, кинозвездой, лауреатом Государственной премии, получившая в 1951 г. звание народной артистки РСФСР. В 1924 г., окончив школу, поступила в студию Юрьева Ю. М. при Академическом театре драмы, по окончании студии В. Т. Кибардину приняли в труппу ленинградского театра Народного дома (с 1930 г. Красный театр). В 1934 г. кинорежиссеры Г. Козинцев и Л. Трауберг предложили театральной актрисе Валентине Кибардиной сняться в киноленте вместе с легендарным Борисом Чирковым в роли учительницы Наташи, подружки веселого рабочего паренька с Нарвской заставы. Это был фильм «Юность Максима» – первый в трилогии о Максиме. Вторая картина – «Возвращение Максима» (1937 г.) и третья – «Выборгская сторона» (1938 г.). Образ Наташи, сыгранный в кинотрилогии, стал этапным для В. Кибардиной. Успех пришел к актрисе в кино, но именно театральная сцена завладела ею полностью. Валентина Кибардина, ведущая актриса, играла в спектаклях избранного репертуара Большого драматического театра (БДТ). Кинотрилогия о Максиме имела зрительский успех, и талантливая актриса В. Кибардина вошла в историю кино. Но фильм определили прозвучавшие с экрана полные искреннего лиризма слов и напева два песенных куплета, относящиеся к жанру городского фольклора: «Крутится, вертится шар(ф) голубой, крутится, вертится над головой, крутится, вертится, хочет упасть, кавалер барышню хочет украсть».

Валентина Кибардина, ученица Юрия Юрьева, актриса ленинградского Большого драматического театра, сыграла в приключенческом

фильме «Первоклассница» И. Фрэза, в фильме «Жизнь в цитадели», поставленном по одноименной пьесе эстонского писателя А. Якобсона, «Волга, Волга», «Барьер неизвестности» Н. Курихина, «Письма к живым», «Не забудь… станция Луговая», фильмах-спектаклях «Враги» М. Горького, «Разлом» Б. Лавренева, «Достигаев и другие» Н. Рашевской.

В фокусе биографий отца и дочери Кибардиных прослеживаются сложности принятия решений, обоснование целей и мотивов, раскрывающих взаимопонимание людей, интерпретации жизненного пути личности в контексте истории и культуры. В биографиях воспроизводится диалог между особенностями духовного мира личности, поколениями и культурами, раскрывается духовный мир человека, его поиски, трудности, препятствия, признание. Биографии отражают и закрепляют многообразные социальные связи на определенном этапе жизненного пути, раскрывают содержание родственных, соседских, дружеских, профессиональных и иных привязанностей, показывая взаимовлияние, предпочтения и вкусы, мнения и ценностные ориентации в жизни личности.

ЛИТЕРАТУРА

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 8: Канто – Кулі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 8. – 576 с.

2. Памяць: Гіст.-дакументальная хроніка Віцебска: у 2 кн. Кн. 1 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]: маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2002. – 648 с.

3. http://www.sb.by/forum/article/tri-izyashchnykh-silueta-na-serebryanoy-plastine.html.

УДК 130.2(476)

**Цяцерыч В. П.** – студэнтка

## ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ І ЯЕ АХОВА

*Навуковы кіраўнік* – ***Радзюк А. В.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Еўрапейская культурная спадчына – гэта інтэлектуальны і духоўны рэсурс, які аб'ядноўвае народы еўрапейскага кантынента і ўмацоўвае пачуццё самабытнасці кожнага з іх. Беларусь, якая з'яўляецца геаграфічным цэнтрам Еўропы і яе культурным складнікам, яшчэ ў 1993 г. далучылася да Еўрапейскай культурнай канвенцыі Савета Еўропы і з таго часу прымае актыўны ўдзел у святкаванні Дзён еўрапейскай

спадчыны. Кожны верасень у Рэспубліцы Беларусь у рамках арганізацыі гэтых мерапрыемстваў зацікаўленай грамадскасці прапануецца наведаць аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны краіны, музеі, выставы, археалагічныя мясціны і іншае.

Праз правядзенне Дзён еўрапейскай спадчыны ў Беларусі звяртаецца ўвага на неабходнасць больш дзейснага ўдзелу ў працэсе захавання культурных набыткаў краіны, а таксама адбываецца знаёмства суайчыннікаў з культурнай разнастайнасцю еўрапейскіх краін, што спрыяе развіццю ўзаемаразумення паміж народамі.

Беларусь прайшла доўгі і складаны шлях гістарычнага развіцця. Першыя гарады-княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явіліся ў IX стагоддзі. Да нашых часоў захаваліся такія старажытныя помнікі архітэктуры, як Сафійскі сабор XI ст. у г. Полацку, Барысаглебская (Каложская) царква ў г. Гродна XII ст., замкі ў г. Лідзе (XVI ст.) і Гродна (XI–XIX стст.), часткова захаваўся па сённяшні дзень Навагрудскі замак – выдатнейшы помнік сярэднявечнай абарончай архітэктуры.

Без павагі да гістарычнага мінулага няма акрэсленай будучыні. Глыбокае веданне сваіх каранёў, павага да спадчыны, якая засталася нам ад продкаў, спрыяюць умацаванню нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самааднаўленню нацыі. "Сучасны палац культуры Беларусі" магчыма пабудаваць толькі на гістарычных мурах.

З 2010 г. упершыню на Беларусі праводзіцца акцыя «Культурная сталіца», якая мае на мэце звярнуць увагу менавіта на тое, што кожны грамадзянін нашай краіны, незалежна ад таго, пражывае ён у сталіцы ці ў іншым горадзе, мае права атрымаць тое самае багатае, тое, што назапашана, тое, што зроблена ў культуры нашай краіны. Культурная сталіца ў 2010 г. – Полацк, які шырока вядомы ў Еўропе сваёй старажытнай гісторыяй.

Ахова гісторыка-культурных каштоўнасцей – адзін з прыярытэтных накірункаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і перадумова яе ўстойлівага развіцця. Эфектыўнасць гэтай палітыкі забяспечвае заканадаўчая база ў галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны, якая пачала фарміравацца адразу пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі. На сённяшні дзень яна ўключае 9 указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», які ў 2006 г. быў прыняты ў новай рэдакцыі, 10 пастаноў урада Беларусі, 14 пастаноў і загадаў Міністэрства культуры. Сямнаццаць іншых законаў утрымліваюць нормы, якія разглядаюць пытанні аховы спадчыны.

Грунтоўнае прававое забеспячэнне – надзейны падмурак для арганізацыі дзейнасці па зберажэнні культурнага і гістарычнага патэнцыялу краіны. Адным з галоўных аспектаў такой дзейнасці з'яўляецца вядзенне Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, у які ўжо ўнесены 5382 асабліва каштоўныя аб'екты. Тры з іх, а менавіта замкавы комплекс "Мір", архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі роду Радзівілаў у Нясвіжы, геадэзічная дуга Струве, увайшлі ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

У справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны Рэспубліка Беларусь выступае надзейным партнёрам на сусветнай арэне. Нашай дзяржавай былі ратыфікаваны практычна ўсе канвенцыі ЮНЕСКА па ахове культурнай спадчыны, у тым ліку дзве апошнія – "Аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны" (2003) і "Аб ахове і заахвочванні разнастайных форм культурнага самавызначэння" (2005).

З 2005 г. Беларусь прымае актыўны ўдзел у рабоце Міжурадавага камітэта ЮНЕСКА па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У 2009 г. у Спіс нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва, якой патрабуецца тэрміновая ахова, быў уключаны абрад "Калядныя цары" вёскі Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

У Рэспубліцы Беларусь удасканальваецца сістэма рэгулявання і кантролю за станам і выкарыстаннем аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, у аснове якой ляжыць механізм узаемадзеяння рэспубліканскіх і мясцовых органаў, адказных за яе захаванне. У перспектыве мяркуецца мадэрнізаваць працу па захаванні нацыянальных культурных здабыткаў за кошт інтэнсіўнай інфарматызацыі галіны, стварэнні дасканалых баз даных гісторыка-культурных каштоўнасцей, правядзенні інвентарызацыі археалагічных помнікаў і элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

У справе захавання спадчыны ўладныя структуры ўзаемадзейнічаюць з навуковымі ўстановамі і грамадскімі аб'яднаннямі. У Беларусі заканадаўча вызначаны парадак ажыццяўлення грамадскага кантролю за выкарыстаннем і ўтрыманнем гісторыка-культурных каштоўнасцей, выкананнем рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. З гэтай мэтай пры Міністэрстве культуры створана грамадская камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі няўрадавых арганізацый, што займаюцца аховай гісторыка-культурнай спадчыны.

Фарміраванне ўстойлівага іміджу культурнай дзяржавы немагчыма без мэтанакіраванай дзейнасці па захаванні спадчыны. У сучасным глабалізаваным свеце ажыццяўленне такой дзейнасці адбываецца

толькі ва ўзаемадзеянні з іншымі краінамі і культурамі. Беларусь пазіцыянуе сябе як самастойны суб'ект на агульнаеўрапейскай і сусветнай прасторы і з'яўляецца яе неад'емнай часткай. З цягам часу нашы намаганні на шляху інтэграцыі ў культурны кантэкст Еўропы будуць ацэнены ў поўнай меры і адкрыюць у будучым шырокія перспектывы для развіцця культурнага турызму і міжкультурных камунікацый.

ЛІТАРАТУРА

1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны рэспублікі: Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – Мінск, 2006. – № 9. – 2/1195.

2. М а р т ы н е н к а, І. Э. Прававая абарона культурнай спадчыны: вучэб. дапам. / І. Э. Мартыненка. – Мінск, 2003.

УДК 808.26(072)

**Цыркунова Д. С.** – студэнтка

## АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МЕНТАЛІТЭТУ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

*Навуковы кіраўнік – **Малько Г. І.** – канд. філал. навук, дацэнт*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Эпоха глабалізацыі прадугледжвае актыўныя кантакты з носьбітамі іншых моў і культур. Аднак нават бліскучае веданне мовы без разумення культуры яе носьбітаў не прывядзе да ўзаемаразумення, таму ў зносінах важна ўменне інтэрпрэціраваць паводзіны партнёра не ў рамках сваёй уласнай, а ў рамках яго культуры. Менавіта вывучэнне менталітэту вылучае тыя рысы ў паводзінах і светаўспрыманні людзей, якія ў той ці іншай ступені характэрныя для ўсіх носьбітаў дадзенай культуры і могуць выяўляцца на неўсвядомленым узроўні.

***Менталітэт*** – гэта сукупнасць пэўных узораў паводзінаў, звычак і ўстановак у асэнсаванні падзей, характэрных для народа, які аб'яднаны адзіным гістарычным мінулым, адзінай культурнай традыцыяй і пражывае, як правіла, на адной тэрыторыі. Менталітэт чалавека адлюстроўваецца ў яго маўленні, інтанацыі, разумовых вобразах, манеры абдумвання і прыняцця рашэнняў, жэстах, праявах волі, пры пераадольванні бяды і гора. Ён фарміруецца пад уплывам культуры этнасу, традыцый, побыту, сям'і, асяроддзя пражывання.

У старажытны перыяд для менталітэту беларусаў былі ўласцівы політэізм (вера ў адначасовае існаванне шматлікіх багоў); абагаўленне зямлі, нябесных свяцілаў, дрэў, камянёў і іншых прыродных з'яў (пантэізм); перакананасць у рэальным існаванні душы, злых і добрых духаў (анімізм); вербальная магія (вера ў цудатворную сілу асаблівых слоў, выразаў); адчуванне непарыўнага адзінства паміж чалавекам і ўсёй навакольнай прасторай; разнастайныя забабоны, культы і інш.

Ва ўсе часы для беларусаў характэрна прыхільнасць да сваёй зямлі-карміцелькі, свайго роднага краю, імкненне прыстасаваць працу і адпачынак да пэўных прыродна-сезонных цыклаў, пораў года (так званы каляндарны тып менталітэту), пра што пераканаўча сведчыць беларускі народны каляндар з надзвычайным багаццем святаў, прысвяткаў і адпаведных ім песень, танцаў, абрадаў, прымхаў і павер'яў. У іерархіі духоўных каштоўнасцей беларускага народа асаблівае значэнне маюць талерантнасць, якая выяўляецца ў адсутнасці варожасці, схільнасці да кампрамісаў, пошуку справядлівасці без гвалту; памяркоўнасць – уменне прыслухацца да чужога меркавання, павага да людзей з іншымі поглядамі, рэлігіяй (верацярпімасць); любоў да Радзімы, якая праяўляецца ў паважлівым стаўленні да роднага краю, клопаце аб захаванні і памнажэнні яго багацця.

Хрысціянскія прынцыпы знаходзяць сваё адлюстраванне ва ўстрыманні, цярплівасці, выкананні наказаў, любові да бліжняга. Справядлівасць выяўляецца ў імкненні да сацыяльнай роўнасці, дапамогі людзям, якія жывуць у нястачы, барацьбе супраць зняваги слабых. Працавітасць заснавана на сялянскім паходжанні беларусаў, іх клопаце аб уласным кавалку зямлі, працаздольнасці, вынослівасці, гаспадарлівасці.

Менталітэт беларусаў фарміраваўся ў розных гістарычных умовах, спрыяльных і неспрыяльных, што знайшло сваё выражэнне ў фальклоры: казках, анекдотах, паданнях, бываліцах, прымхліцах, прыказках, прымаўках.

Глыбокая народная мудрасць, высокая паэтычнасць вобразаў, нязломная і светлая вера ў чалавека, у яго сілы і магчымасці, маральная цнатлівасць і чысціня, непараўнальны гумар і вострая сатыра, прастата і даступнасць зместу, займальнасць апавядання і, нарэшце, сапраўднае моўнае чарадзейства – вось некаторыя з гэтых вартасцей, якія заўсёды прываблівалі і прываблiваюць да беларускіх ***казак***. Галоўнае ў іх змесце – гэта мары і спадзяванні беларусаў на

лепшае жыццё ў будучым, іх імкненні падпарадкоўваць сабе сілы прыроды і перамагчы сацыяльнае зло, барацьба з чужаземнымі ворагамі-заваёўнікамі. Гэты змест раскрываецца ў вобразах і карцінах фантастычных, звышнатуральных, цудадзейных: *“Залатая яблынька”, “Цудоўная дудка”, “З рога ўсяго многа”, “Ох і залатая табакерка”, ”Бацькаў дар”, “Музыка-чарадзей”, “Пакацігарошак”.* У многіх казках высмейваюцца заганы ў чалавечым характары: непачцівыя адносіны да бацькоў, нетактоўнасць, зайздрасць, імкненне пажывіцца за чужы кошт і інш. Гэтыя творы адлюстроўваюць этычныя погляды народа, яго маральныя прынцыпы, яго разуменне дабра і зла.

У аснову сюжэта ***легенды*** звычайна кладзецца нейкі цуд, неверагоднае здарэнне з удзелам і людзей, і істот звышнатуральных, з умяшаннем сіл цудадзейных: пра стварэнне свету, пра паходжанне жывёл, птушак і насякомых, пра святых і Бога, пра пекла і рай, пра віну і пакаранне за яе, пра дабрачыннасць і ўзнагароджанне за яе, пра чалавечую долю і смерць і пра многае іншае.

***Прымхліца*** – гэта невялічкае вуснае апавяданне аб нейкім незвычайным, цудадзейным і, як правіла, “страшным” здарэнні, удзельнікам ці сведкам якога нібыта быў сам апавядальнік або добра знаёмы ці нават блізкі яму чалавек (сустрэча з нячысцікам, з вурдалакам, з дамавіком, са змяіным царом, з русалкаю і з іншымі падобнымі істотамі): *“Бутрымава прыгода”, “Чорт дурыць падарожных”, “Пра чартоў”, “Нечысць заманьвае ў балота”, “Чорт у віхры”, “Чорт у постаці цяляці”, “Як чорта выганялі”.* Вытокі гэтага самабытнага жанру тояцца ў асаблівасцях старажытнага светапогляду, у веры чалавека ў існаванне надпрыродных сіл, у магчымасць розных чарадзейна-магічных пераўтварэнняў, дзівосных праяў і цудаў.

***Паданне*** часцей за ўсё вырастае з нейкай падзеі мясцовай гісторыі. Істотнай прыкметай многіх паданняў з’яўляецца іх імкненне даць адказ на пытанні, адкуль што ўзялося, як узнікла і чаму так называецца: паходжанне і назвы пэўных населеных пунктаў, рэк і рэчак, азёр і крыніц, курганоў, лесу, паляны, балота і інш.: *“Адкуль мядзведзі на свет узяліся”, “Адкуль пайшлі буслы”, “Як нарадзіліся Нёман і Лоша”, “Адкуль Нясвіж”, “Як паўстаў горад Браслаў”, “Адкуль назва Целяханы”* і г. д. Частка іх звязана з лёсам і жыццём пэўнай асобы, канкрэтнага чалавека, нечым выдатнага і цікавага: *“Пра пане Каханку”, “Пра Чорную Даму”, “Марысін парк”* і інш.

У беларускіх ***прыказках*** і ***прымаўках*** вялікае значэнне надаецца слову, вучэнню, навуцы: *“На навуцы свет стаіць”, “Вучыся, нябожа,*

*вучэнне паможа", "Слова дарожша золата", "Не частуй мяне вінцом, ды прызаві мяне шчыранькім слаўцом", "Слова міма не ляціць", "Прыемнае слова – вясенні дзень", "І не лай, і не перапрашай", "Рынуў слаўцом, як пярцом", "Які павядач, такое яго павяданне", "На канцы языка Кіеў стаіць".*

Беларускія прыказкі і прымаўкі ўслаўляюць працу і працавітасць народа: *"Чалавек жыве век, а добрая справа – два", "Сама птушка ў рукі не ўскочыць", "Рукі да работы, ногі да ахвоты, галава да ўсяго", "Як слонка на небе, то мы на полі", "Мужыка не шуба грэе, а сякера", "Як дбаем, так і маем", "Не хваліся нажаўшы, а хваліся змалаціўшы", "Дзе няма работы, там няма ахвоты"*; павагу да іншых народаў: *"Ідзеш на чужую старану – пільнуйся, каб не было сараму".* Вельмі цікавыя ёсць і прымаўкі: *"Пражыў век – ні сабака, ні чалавек", "Што яму законы, калі суддзі знаёмы", "Чыста ходзіць, ды нячыста жыве"* і г. д.

У ***загадках*** адлюстроўваецца кемлівасць народа, яго ўменне ўбачыць самыя цікавыя адметныя рысы чалавека, прадмета, паняцця.

